СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.44, 17.03, 9.19;
Віцебск — 7.38, 16.49, 9.11;
Магілёў — 7.33, 16.53, 9.20;
Гомель — 7.26, 16.55, 9.29;
Гродна — 7.58, 17.19, 9.21;
Брэст — 7.57, 17.25, 9.31.

МЕСЯЦ:
Маладзік 3 лютага.

ІМЯНІНЫ:
Марыі, Аркадзя, Яна, Пятра, Сымона, Язэпа, Давыда.

ЗВЯЗДА

8

ЛЮТАГА 1992 г.
субота, № 28 (21806)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 40 кап.

РОЗГАЛАС

ЦЭНЫ НА РЫНКАХ

(у рублях) 7 лютага

Гомель. Бульба —2.50, капуста —2.50—3, свініна — 60—100, ялавічына — няма, гусь —160, яблыкі —35—80, мандарыны — 130—140, журавіны (1 шкл.) —5, свежыя шампіньёны —42, мёд —130—140.

Віцебск. Бульба—4, морква —2, цыбуля —10, цыбуля зялёная —70, рэдзька (1 шт) —5—8, свініна —50—90, ялавічына — няма, малако —25, смятана —40, яйкі —15, мандарыны — 35—40, лімоны —68—80.

Брэст. Бульба —4, капуста (1 качан) —10, цыбуля —7—15, свініна —170—180, сала —35—40, ялавічына —60—100, індык —500—700, гусь —200—250, масла —100, яйкі —30, агуркі свежыя —200, памідоры свежыя —200, яблыкі —30—60, мандарыны —60, мёд —150—180.

«Агенцтва РІД».

«ТРЭБА ЎСТАНАЎЛІВАЦЬ ДАГАВОРНЫЯ ЗНОСІНЫ З ЗАГРАНІЦАЙ НА ВЯЛІКІ ТЭРМІН»,

— сказаў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч пасля вяртання са Швейцарыі, дзе адбыўся Сусветны эканамічны сімпозіум.

— Праграма сімпозіума была вельмі насычанай, — зазначыў С. Шушкевіч. — Штодзень — шматлікія сустрэчы з вядомымі палітычнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, дзелавымі людзьмі Захаду. Вельмі плённымі, на мой погляд, былі размовы з прэм'ер-міністрам Швецыі, прэзідэнтамі Балгарыі, Македоніі, Швейцарскай Канфедэрацыі, міністрам фінансаў ФРГ, кіраўнікамі Савета Еўропы і іншымі.

Адметна, што сустрэчы С. Шушкевіча ў большасці сваёй адбыліся па ініцыятыве менавіта іншага боку. Гэта сведчыць аб той зацікаўленасці, якую выказваюць замежныя краіны да Рэспублікі Беларусь. Так, даведаўшыся, што ў рабоце сімпозіума прымае ўдзел С. Шушкевіч, на сустрэчу з ім самалётам з Жэневы тут жа вылецеў кіраўнік дабрачыннай арганізацыі па дапамозе дзецям, што хварэюць на СНІД і рак. Спецыяльна запрасілі на сустрэчу кіраўніка беларускага парламента і 40 бізнесменаў Швейцарыі.

— Маё перакананне, — сказаў С. Шушкевіч, — што мы праводзім не лепшую палітыку. Наш урад праводзіць палітыку хутчэй мітынговую, чым палітыку, скіраваную на якаснае паляпшэнне спраў. Зараз у нас ёсць усе падставы выкарыстаць добрыя адносіны замежных дзяржаў да рэспублікі. Трэба больш актыўна супрацоўнічаць з імі. І ўступаць ў дагаворныя адносіны на вялікі тэрмін, каб не паўтарыць тых памылак, якія зрабіла кіраўніцтва былога СССР. Шэраг такіх пагадненняў напярэдадні абмеркавання, і, я спадзяюся, што гэта дазволіць устанавіць добрыя дзелавыя кантакты з заходнімі бізнесменамі.

Людміла КЛАСКОЎСКАЯ.

РЭФЕРЭНДУМ: ЗА І СУПРАЦЬ

Аб гэтым гавораць пакуль мала. Усё яшчэ наперадзе. Несумненна сёння толькі адно: падзея, якая можа адбыцца летам гэтага года, адсуне на задні план усё астатняе.

Вось ужо месяц, як ініцыятыўная група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі БНФ, БСДГ, Сялянскай партыі, іншых палітычных сіл, рыхтуюць дакументы ў якасці арганізатараў рэферэндуму на тэрыторыі Беларусі аб датэрміновых перавыбарах Вярхоўнага Савета і сфарміраванні «ўрада народнага даверу».

Рэферэндум — з'ява для нас ужо не новая: год назад паспыталі гэтага «хлеба». І адбылося ўсё даволі гладка: вынікі з пэўнай доляй упэўненасці можна было прадказаць задоўга да самой падзеі. А хто бярэцца сёння стаць прагназістам? Што чакае нас? Сацыялагічныя даследаванні праводзяцца зараз рэгулярна. Яны паказваюць, што, сапраўды, кіруючымі органамі ўлады задаволены далёка не ўсе, але, разам з тым, вядома і вось яшчэ што: партыі, якія зараз існуюць у рэспубліцы, уключаючы і «падпольную» КПБ, усе разам (а такой кааліцыі ў рэальнасці ніяк быць не можа) змогуць набраць (калі б выбары адбыліся сёння) 35—40 працэнтаў галасоў. Большасць жа людзей не бачыць той сілы, якой можна даверыцца, якая зможа вывесці дзяржаву з тупіка.

Другі аспект: людзі стаміліся ад палітыкі.

Але ж так ці інакш — машына заведзена. Быць рэферэндуму ці не, а калі быць, то чаго ад яго чакаць — вырашаць давядзецца нам усім.

Сёння ў чарговым экспрэс-апытанні мы вырашылі пацікавіцца, што думаюць людзі аб гэтай будучай падзеі.

Марыя Іванаўна Куляшова, вахцёр інтэрната:

— У маіх гадах хвалявацца шкодна, таму ўключаю тэлевізар толькі калі ідзе фільм або канцэрт, у газетах чытаю апошнюю старонку. Ведаеце, так лягчэй жыць. Праўда, гэта не выратоўвае ад жыццёвых праблем, але ўмешвацца ў палітыку мне няма чаго, сваім голасам я нічога ў ёй не змяню. А да лета яшчэ дажыць трэба...

Іван Санько, дырэктар саўгаса:

— Крытыкаваць сёння можна ўсіх і ўсё. Гэта вельмі лёгкая справа. І нават рэферэндум арганізаваць няцяжка — пастаяць на вуліцы, сабраць подпісы. Але што гэта дасць? Мы ўвесь час крытыкуем Вярхоўны Савет за маруднасць у рабоце, за непаслядоўнасць. Ну, добра: правядзём новыя выбары, будзе сфарміраваны новы парламент і ўрад. Але ж перш чым заняцца вырашэннем надзённых эканамічных праблем, яны зойдуцца дзяльбой партфеляў і крэслаў. Колькі часу на гэта будзе затрачана? Год — паўтара, як мінімум! Далей: дзе ўпэўненасць, што ў новыя органы ўлады прыйдуць кампетэнтныя людзі, а не дылетанты? Так што трацiць час на выбары няма патрэбы. Неабходна простая рэарганізацыя цяперашняга саставу Вярхоўнага Савета, скарачэнне яго колькасці, парламенцкая работа павінна быць асноўнай для дэпутатаў.

Мікалай Вашкевіч, камерцыйны дырэктар малога прадпрыемства:

— Скажу прама: дзейнасцю сённяшняга Вярхоўнага Савета і ўрада мы не задаволены: падаткі душаць нас, мы не можам разгарнуцца. Ну, а што нам застаецца рабіць? Павышаць цэны? Нічога ж іншага не застаецца. Ізноў страты панясе народ...

Падрыхтаваў Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Спыняюцца прадпрыемствы: хто вінаваты?

«ГОМСЕЛЬМАШ»: 30-тысячны калектыў амаль цалкам адпушчаны ў вымушаны месячны водпуск, — няма сыравіны і камплектуючых.

«МАЗ»: ужо трэці дзень дзесяткі тысяч людзей не працуюць. Адміністрацыя ламае галаву, — адкуль браць грошы, каб выплаціць зарплату.

«БелАЗ»: вытворчасць фактычна спынена. Няма пластмасы, алюмінію, жалеза. 600 ужо сабраных аўтамабіляў стаяць без колаў — няма каўчуку. Многія спажыўцы адмаўляюцца ад аўтамабіляў, бо кошт аднаго 30-тонніка вырас з 73 тысяч рублёў да 1 мільёна.

Гэта — толькі некаторыя звесткі, якія прагучалі ўчора з вуснаў прафсаюзных актывістаў рэспублікі ў час іх сустрэчы са Старшынёй Вярхоўнага Савета Станіславам Шушкевічам і прадстаўнікамі ўрада. Ці спадзяваліся лідэры прафсаюзаў пачуць ад вярхоўных улад універсальныя рэцэпты ад эканамічных хвароб, якія за апошнія дні паралізавалі ўвесь гаспадарчы арганізм рэспублікі? Наўрад ці. Але цярпенне людзей не безмежнае. І настроі, якія пануюць цяпер у беларускім грамадстве, як у люстэрку, адбіліся на танальнасці тых, хто выступаў учора на сустрэчы ў Вярхоўным Савеце.

«Спыніць цэнавы беспрэдзел», «тэрмінова скараціць падаткі з прадпрыемстваў», «скасаваць усе мытні», «увесці жорсткія меры адказнасці за ўсе пастаўкі», — вось асноўныя патрабаванні да ўрада і Вярхоўнага Савета, якія гучалі ў многіх выступленнях.

Звычайна карэктны і стрыманы, Станіслаў Шушкевіч часам нават дазваляў сабе перарываць прамоўцаў, якія рабілі асабліва кплівыя выпады ў адрас Вярхоўнага Савета і ўрада, абвінавачваючы іх у тым, у чым вінаваты не толькі яны.

— Мне вядомы ўсе цяжкасці, пра якія вы гаворыце. Але калі вы хочаце, каб я, як горкаўскі Данка, вывеў вас з ямы, у якую мы ўсе разам сунуліся столькі гадоў, то гэта беспадстаўныя спадзяванні,— заўважыў лідэр парламента. — Можа, самая кепская спадчына, якая засталася вам ад папярэднікаў, — гэта спадзяванне ва ўсім толькі на дзяржаву. Давядзецца прымусіць сябе зразумець, што час той мінуў. Вярхоўны Савет і ўрад павінны распрацаваць механізм сувязей паміж прадпрыемствамі, але не могуць і не павінны аказваць за канкрэтныя пастаўкі канкрэтных пастаўшчыкоў. Калі спыняецца канвеер, то вінаваты ў гэтым, відаць, не толькі і не столькі Вярхоўны Савет, колькі адміністрацыя прадпрыемстваў, якія не змаглі дамовіцца паміж сабой.

Зрэшты, дамаўляцца ўсё цяжэй. І справа не ў абмежаваннях на ўвоз і вываз прадукцыі з рэспублікі, пра якія шмат гаварылася ў час сустрэчы.

— Калі Цюмень не адгружае нам нафту, то гэта не значыць, што так захацеў Б. Ельцын, — гаварыў С. Шушкевіч. — Больш таго, нават Ельцын не можа прымусіць іх выконваць дагаворныя абавязацельствы. Калі ж мы выходзім на прамы кантакт, — чуем ультыматыўнае: «Давайце ўзамен мяса». Але ж мы ўжо паставілі мяса Маскве? «Дык з Масквы і нафту патрабуйце».

Ніжэй у канспектыўным выглядзе перадаём сэнс адказаў С. Шушкевіча і першага намесніка Старшыні Савета Міністраў М. Мясніковіча на найбольш злабадзённыя пытанні.

Аб палітычным становішчы на Беларусі.

Найбольш правыя і найбольш левыя сілы ўсё больш зближаюцца. Іх магчымая перамога ў рэферэндуме будзе пірвай перамогай, якая яшчэ больш паралізуе эканамічнае і палітычнае жыццё.

Хопіць нам баек БНФ, што розныя палітычныя сілы не здольны аб'яднацца. Мы перажываем такі ж перыяд, які адразу пасля вайны перажывалі многія заходнія краіны. Яны пераадолелі цяжкасці толькі дзякуючы кансалідацыі.

Аб захадах па ўпарадкаванню паставак і цэн.

Сёння ў Маскве лідэры ўрадаў планююць падпісаць дакументы, якія б устанаўлівалі жорсткую адказнасць за зрыў паставак, а таксама абмяжоўвалі ўзровень рэнтабельнасці прадпрыемстваў - манапалістаў 25—50 працэнтамі.

Аб чутках пра адмену купонаў.

Чуткі беспадстаўныя, — адмяняцца купоны ў бліжэйшы час не будуць. Сёння гэта — адна з прыступак грашовай рэформы і сродак абароны спажывецкага рынку.

Аб новых падатках.

Гэта — цывілізаваная сістэма падаткаў. Агульны працэнт іх у нас нават ніжэйшы, чым у краінах Усходняй Еўропы. Папрацуем з гэтымі падаткамі першы квартал — па выніках, магчыма, унясём нейкія карэктывы. (Па словах М. Мясніковіча).

Урад спачатку заблытаў сітуацыю з падаткамі, а цяпер спрабуе зваліць віну на Вярхоўны Савет (па словах С. Шушкевіча).

Аб вайскоўцах на Беларусі.

Каля 1.500 афіцэраў, якія прызваны з Беларусі, але служаць за яе межамі, хочуць вярнуцца на Радзіму. Паехаць з Беларусі выказалі жаданне толькі двое.

Аб магчымых акцыях прафсаюзаў у дні сустрэчы на вышэйшым узроўні ў Мінску.

Некаторыя лідэры ФПБ выказваліся ў час сустрэчы за тое, каб правесці ў гэтыя дні мітынгі, пікеты і г. д., каб паўздзейнічаць на лідэраў СНД. Старшыня канфедэрацыі працы Беларусі М. Собаль, наадварот, выступіў за тое, каб утрымаць людзей ад акцый на плошчы.

С. Шушкевіч даў зразумець, што магчымыя акцыі, якія могуць перашкодзіць ходу перагавораў у Мінску, будуць спыняцца і забараняцца.

Валянцін ЖДАНКО, палітычны аглядальнік.

Вёска стаіць на каленях

ЛІДА, (Гродзенская вобласць). «Вёска стаіць на каленях. І калі мы не выправім становішча, новыя цэны і падаткі пахаваюць яе канчаткова». Гэтыя словы старшыні аграпрамысловага калгаса-камбіната «Прагрэс» Гродзенскага раёна А. Дубко як найлепш адлюстроўваюць настрой кіраўнікоў калгасаў, саўгасаў і перапрацоўчых прадпрыемстваў Гродзеншчыны, якія 6 лютага сустрэліся са Старшынёй Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. Кебічам.

— Складваецца ўражанне, што нашы радыкальныя рэформы адарваны ад жыцця, — лічыць А. Дубко. — Якім шляхам пайшлі ўлады? Спачатку павялічылі закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю — у сярэднім у 3,9 раза. А потым... Цэны на прамысловыя тавары для вёскі ўзраслі прыкладна ў 8 разоў, на вугаль — у 35, метал — у 23, на будаўніцтва — у 8—10, на трактары і запчасткі — адпаведна ў 19 і 15 разоў. А возьмем падаткі. Наш калгас сёлета разлічвае атрымаць 140 мільёнаў прыбытку. Дык вось, больш за палавіну, прыблізна 76,2 мільёна, у нас адбяруць у якасці падаткаў. Раней яны складалі 19—23 працэнты ад прыбытку. Сёння пяць гаспадарак Гродзенскага раёна фактычна павінны быць аб'яўлены банкрутамі. А хутка такі лёс напаткае і іншых, у тым ліку і наш калгас.

Занепакоенасць Аляксандра Іосіфавіча падзяляюць усе яго калегі па старшынёўскаму корпусу. Напрыклад, паводле падлікаў старшыні калгаса «Ленінскі шлях» Карэліцкага раёна І. Паўловіча, пасля выплаты зарплаты і падаткаў у касе гаспадаркі застанецца толькі 6 з 67 мільёнаў прыбытку, які тут сёлета плануюць атрымаць. Што «важаць» гэтыя 6 мільёнаў, калі за камбайн трэба заплаціць амаль 2 з іх, а за замену гусеніцы на трактары вылажыць 50 тысяч рублёў? Між тым, каб зарабіць гэтыя 50 тысяч калгасу трэба здаць 14,5 тоны малака.

Кіраўнікі гаспадарак, якія выступілі на сустрэчы, лічаць абсурдным падатак на занятасць, які даведзены да калгасаў і саўгасаў. Аб якім беспрацоўі можа ісці гаворка, калі вёска літаральна задыхаецца ад няхваткі рабочай сілы і, вобразна кажучы, цалуе рукі кожнаму пенсіянеру за тое, што ён выходзіць на працу? А наша заканадаўства, як адзначыў адзін з ветэранаў старшынёўскага корпуса Гродзеншчыны А. Маханько, яшчэ і адбівае ў пенсіянераў усялякую ахвоту працаваць, перашкаджаючы ім атрымліваць столькі грошай, колькі яны зарабілі. У чыіх інтарэсах гэтыя абмежаванні?

Шмат складаных пытанняў было адрасавана В. Кебічу на гэтай сустрэчы. Ён, адзначыў, не стаў раскідваць абяцанкі і вылучаць шырокамаштабныя праграмы. На думку прэм'ер-міністра, цяжка прадбачыць, што нас чакае нават у канцы гэтага года і, каб выжыць, трэба многае ўдасканаліць у рабоце аграпрамысловага комплексу і яго сумежнікаў.

В. Кебіч, у прыватнасці, заявіў, што ўрад усё зробіць для таго, каб разам з іншымі дзяржавамі Садружнасці абмежаваць рост цэн з боку манапалістаў і каб калгасы, саўгасы і фермеры не куплялі «МАЗ» за мільён, а камбайн — амаль за два, і тым самым фінансава ўзмацніліся.

— Мы павінны даць усю ўладу вытворцу, — сказаў В. Кебіч. — За кошт тых падаткаў, якія плацяць калгасы і саўгасы, утрымліваюцца вялізныя кіруючыя структуры. Гэту дзяржаву ў дзяржаве трэба ўсё ж разбурыць. Хіба вяскоўцам сёння патрэбна нянька, якая іх гадуе і ўказвае, чым займацца? Роля гэтых структур павінна зводзіцца да давядзення, на першым часе, дзяржзаказу на патрэбы гарадоў, навукова-тэхнічнага прагрэсу і, магчыма, якіх-небудзь кансультацый.

Мяркуючы па рэакцыі залы, удзельнікі сустрэчы падтрымалі такую пазіцыю прэм'ер-міністра. Паглядзім, што атрымаецца на справе.

Закрануў В. Кебіч і пытанне, якое сёння наўрад ці па душы кожнаму калгаснаму старшыні. Ён заклікаў кіраўнікоў гаспадарак хутчэй ісці насустрач гараджанам у выдзяленні ім зямельных участкаў. Нельга ж дапусціць, каб, як ужо здараецца ў Расіі, чалавек вяртаўся з горада ў вёску і сілай забіраў зямлю.

Шмат гаварылася на сустрэчы аб лёсе вырабленай у калгасах і саўгасах прадукцыі. Чаму, напрыклад, вартасць мяса ў магазінах практычна не залежыць ад яго якасці? Тэарэтычна розніца ў цане ёсць. Але што адбываецца? Можна мяса фасаваць у адпаведнасці з яго якасцю, вось толькі нявыгадна гэта — ні мясакамбінатам, ні тым больш работнікам гандлю. Бо нельга будзе красці.

— Трэба ўсіх рубшчыкаў мяса перавесці з магазінаў на мясакамбінат, сказаў на сустрэчы старшыня Гродзенскага абласнога Савета Д. Арцыменя. — Няхай там яго і фасуюць.

Што ж, мясцовай уладзе, як кажуць, і карты ў рукі.

Абмяркоўвалася на сустрэчы і такая праблема: чаму б не дазволіць калгасам і саўгасам мець свае фірменныя магазіны ў Мінску, ды і ў іншых буйных гарадах, каб накіроўваць туды сваю прадукцыю? Выгада відавочная. Па-першае, рознічная цана гэтай прадукцыі будзе меншай, чым у дзяржгандлі, што не можа не спадабацца пакупнікам. А па-другое, за кошт фірменных магазінаў можна сур'ёзна падарваць дыктат тых, хто сёння стаіць ля размеркавання прадукцыі па гандлёвых кропках.

В. Кебіч падтрымаў гэтую ідэю, і ёсць надзея, што ў бліжэйшы час яна рэалізуецца на практыцы.

У той жа дзень В. Кебіч пабываў на прамысловых прадпрыемствах Лідчыны, у фермерскай гаспадарцы, сустрэўся з ваеннаслужачымі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СЁННЯ ПРЭМ'ЕРА

У дзіцячым музычным тэатры «Казка» чарговая прэм'ера. Сёння на сцэне Дзяржаўнага тэатра музкамедыі ўрачыста адкрыецца заслона, і гледачы ўбачаць такіх знаёмых для ўсіх пакаленняў Кая і Герду. Паказаць «Гісторыю Кая і Герды» стала магчымым у выніку творчага супрацоўніцтва з вядомым рэжысёрам з Санкт-Пецярбурга Ю. Аляксандравым і яго земляком кампазітарам С. Баневічам.

На дзіва вясёлым і прыгожым атрымаўся спектакль. Раю паглядзець, а для першага заёмства прапаную два фотаздымкі, зробленыя на генеральнай рэпетыцыі. На іх вы бачыце адну з масавых сцэн «Гісторыі Кая і Герды» і Снежную каралеву ў выкананні артысткі І. Літвін.

Я. ПЯСЕЦКІ.

НЕВЯСЁЛАЯ НАВІНА

Прыкра, горка пра гэта пісаць, але трэба. Рынак усё мацней і мацней сціскае кожнага з нас у сваіх неміласэрных абдымках. Прадпрыемствы ўсіх галін павысілі цэны на тавары і паслугі ў дзесяткі разоў, а наша зарплата калі і ўзрасце, то толькі ўдвая. Прэса, журналісты, якіх першымі кінулі ў рыначны вір, супраціўляліся як маглі. Падпісныя цэны, кошт газет у рознічным гандлі былі да апошніх дзён яшчэ боскімі. Мы разумелі: так званыя свабодныя, рыначныя цэны на газеты якраз і пазбаўляюць кожнага з нас дэклараванай законамі свабоды, права на атрыманне інфармацыі, права ўдзельнічаць у фарміраванні і абмеркаванні дзяржаўнай палітыкі, права быць пачутымі структурамі ўлады. Пад пагрозай аказаліся дэмакратыя і галоснасць — галоўны і пакуль што адзіны набытак нашага часу.

Дыктат манапалістаў прывёў да рэзкага павелічэння расходаў на выданне газет. Мінулагодняя падпісная цана не кампенсуе выдаткаў. Каб выканаць свае абавязацельствы перад падпісчыкамі, «Звяздзе», напрыклад, трэба знайсці дадаткова 10 мільёнаў рублёў. І чым большы тыраж, тым большыя страты. «Советской Белоруссии», якая ўжо прыпыняла свой выхад з-за адсутнасці паперы, спатрэбіцца каля 60 мільёнаў рублёў. І калі раней рэдакцыі газет радаваліся кожнаму новаму падпісчыку, то зараз сітуацыя іншая. Так, за студзень колькасць пастаянных чытачоў газеты «Советская Белоруссия» вырасла на 12 тысяч чалавек, што прывяло да 1 мільёна 200 тысяч рублёў дадатковых страт. Больш стала падпісчыкаў і ў «Звязды», на дзесяткі тысяч рублёў выраслі таксама і яе страты. І гэта толькі за адзін месяц.

У такіх умовах мы бачым два выйсці. Першае — наогул прыпыніць падпіску на газету на бягучы год. Другое — устанавіць падпісную цану з улікам расходаў на выданне газеты. Рэдкалегія «Звязды» схіляецца менавіта да апошняга варыянта, таму што першы пазбаўляе чалавека права выпісаць газету нават тады, калі ён мае для гэтага магчымасці. Паводле падлікаў эканамістаў, **падпісная цана на год павінна складаць 124 рублі 80 капеек, на паўгода —62 рублі 40 капеек, на тры месяцы —31 рубель 20 капеек.**

Разлікі праводзіліся пры зыходнай цане паперы ў 2.500 рублёў за тону. На жаль, ужо зараз можна сказаць, што і новая падпісная цана не адпавядае рэальнасці. Вытворцы паперы ў апошнія дні паднялі яе кошт да 13.825 рублёў за тону.

Разумеем, такая навіна будзе не на радасць нашым новым падпісчыкам. Не на радасць яна і калектыву «Звязды», яе заснавальнікам.

Рэдкалегія.

Справядлівасць, міласэрнасць, еднасць

Пад такім дэвізам пачаў сваю работу ў Мінску ў будынку былога ЦК камсамола ўстаноўчы з'езд Беларускай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій. Яго ініцыятарамі выступілі Архіўнае ўпраўленне Рэспублікі Беларусь, Акадэмія навук РБ, Беларускі фонд культуры, Беларускі дзіцячы фонд, Бабруйская, Брэсцкая, Гомельская асацыяцыі незаконна рэпрэсіраваных і іншыя арганізацыі і аб'яднанні.

Дарэчы, правядзенне з'езда ўвесь час адкладвалася, але ініцыятыўная група па скліканню першага ў Беларусі форуму палітычных рэпрэсіраваных здолела ўсё ж сабраць сто пяць дэлегатаў, якія хочуць стварыць сваю асацыяцыю, асноўнымі мэтамі і задачамі якой павінны стаць актыўны ўдзел у аднаўленні правоў і абароне інтарэсаў неабгрунтавана рэпрэсіраваных грамадзян, аказанне ім, членам іх сем'яў прававой, матэрыяльнай, сацыяльнай, бытавой і іншай дапамогі, увекавечанне памяці ахвяр, устанаўленне месц пахавання рэпрэсіраваных.

Безумоўна заслугоўвае пільнай увагі ініцыятыва ўрада па стварэнню мемарыяльнага комплексу «Курапаты». Дагэтуль на тэрыторыі рэспублікі няма ніводнага помніка ахвярам сталінізму. Хоць пацярпела тут ад неабгрунтаваных рэпрэсій у той ці іншай ступені каля двух мільёнаў чалавек. У жывых жа, паводле папярэдніх падлікаў, 3,5 тысячы такіх людзей сацыяльнае забеспячэнне сапраўды далёка не лепшае. Гэта група насельніцтва, у якой дзяржава забрала маладосць, дабрабыт і гонар, увогуле не была ўключана ў свой час у рэспубліканскі Закон аб пенсіях.

Узнімалася на з'ездзе і пытанне аб правядзенні міжнароднага трыбунала па фактах злачынстваў сталінізму. Доктар гістарычных навук Георгій Штыхаў задаў пытанне ў залу: ці можна судзіць ідэалогію? Думаецца, што час асуджэння яе настаў. Як настала пара змянення адносін да незаконна рэпрэсіраваных, іх правоў і льгот.

Застаецца дадаць, што з'езд збіраецца прыняць статус Беларускай асацыяцыі, разгледзець палажэнне аб рэвізійнай камісіі, выбраць кіруючыя органы асацыяцыі.

Аляксандр КОКТЫШ.

ІДЗЁМ ДА РЫНКУ

Беларускі бізнес: 45 дзён і ўсё жыццё

Асамблея дзелавых колаў Беларусі — гэта ўжо, хоць і нядаўняя, аднак усё-такі гісторыя. Справа цяпер за выкананнем прынятых на ёй рашэнняў. На гэтую работу адпушчана толькі 45 дзён.

Пра ўсё гэта і ішла размова на прэс-канферэнцыі, якая адбылася пазаўчора ў Саюзе прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь.

Як характарызаваць тыя ўмовы, у якіх усе мы сёння жывём? Магу прасвятліць чытачоў: жывём мы, паважаныя спадары, ва ўмовах стагфляцыі. За гэтым страшнаватым слоўным монстрам хаваецца і страшнае паняцце. Стагнацыя, поўны застой у вытворчасці, плюс грашовая інфляцыя — вось што гэта азначае на мове эканомікі.

Рэзкі рост цэн цягне за сабой такое ж рэзкае падзенне спажывецкага попыту (яго прыкметы, дарэчы, ужо ёсць), а гэта, у сваю чаргу, будзе біць па вытворчасці. Маюцца і адпаведныя разлікі, якія паказваюць: калі ў сацыяльна-эканамічнай сферы ўсё і надалей пойдзе так, як робіцца сёння, дык у бліжэйшы час цэны ў Беларусі падскочуць у... 57 разоў!

Лакаматывам гэтай лавіны па праву выступаюць бюракратычная «лібералізацыя» цэн, а таксама новае падатковае заканадаўства, па-каўбойску прынятае Вярхоўным Саветам рэспублікі. На гэтым змрочным фоне толькі адна светлая пляма — прайшоўшая асамблея дзелавых колаў. Вельмі своечасовай аказалася гэтая акцыя, вельмі слушныя прапановы і рашэнні з'явіліся на свет. Асамблея, вобразна кажучы, працягваецца: у Саюзе прадпрымальнікаў дзень за днём рыхтуюцца неабходныя дакументы, ідзе сумесная работа з падраздзяленнямі Савета Міністраў, камісіямі Вярхоўнага Савета, акадэмічнымі інстытутамі.

І зразумела, чаму на ўсё пра ўсё адпушчана толькі паўтара месяца — агульнае наша становішча такое цяжкае, што хуткаплынны час большых тэрмінаў прадаставіць нам не можа. За 45 дзён трэба вырашыць кардынальную задачу: наколькі эфектыўна дзяржава збіраецца дапамагчы малому бізнесу, прадпрымальніцтву, каб тыя, у сваю чаргу, змаглі пасадзейнічаць у выратаванні нашай агульнай эканомікі. Зразумела, што галоўнае ў жыцці маладога бізнесу — гэта самападтрымка, але і ад дзяржавы спатрэбяцца немалыя фінансавыя «ўліванні»: мінімальная сума вызначаецца прыблізна ў размеры 500 мільёнаў рублёў...

Многія памятаюць, што на асамблеі Старшыня Савета Міністраў рэспублікі В. Кебіч зрабіў рашучыя крокі насустрач прадпрымальніцтву, абяцанняў было нямала. Але ж усе мы маем вопыт таго, як у структурах улады многія з добрых задумак паціху каналі. Як будзе на гэты раз? Прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў У. Карагін абстаноўку абмалёўвае так:

— Прэм'ер абяцаў ліквідаваць усе гэтыя гандлёвыя трэсты і аб'яднанні, аднак што сёння канкрэтна робіцца ў гэтым напрамку, сказаць пакуль не магу. Затое пачата ўжо раздзяржаўленне ўласнасці ў камунальна-бытавой сферы, у прыватнасці цырульняў — яны пераходзяць ва ўласнасць працоўных калектываў. Думаю, што не пакрывіў душой Вячаслаў Францавіч і тады, калі адмоўна выказаўся аб падатковым заканадаўстве — тут абавязкова павінны быць змены. Што датычыцца прапанаванай мне пасады саветніка пры Старшыні Саўміна, то скажу, што даў згоду працаваць там не ў адзіным ліку, а пры ўмове, што пры ўрадзе будзе створана група прадпрымальнікаў-кансультантаў — такая пазіцыя нашага саюза.

У далейшай размове высветлілася, што, сапраўды, сустрэчны рух на перагоне «ўлада — прадпрымальніцтва» пачаўся ўжо. Так, Саўмін рэспублікі прыняў спецыяльную пастанову «Аб развіцці прадпрымальніцтва і ўтварэнні Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў». У адпаведнасці з гэтым рашэннем Дзяржкамплану разам з грамадскімі арганізацыямі прадпрымальнікаў даручана распрацаваць дзяржаўную праграму падтрымкі і развіцця бізнесу, а таксама ў месячны тэрмін падрыхтаваць

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ТВАЁ СЛОВА, ЧЫТАЧ!

«ОПТ-9195»—цацка бракаробаў

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты «Звязда»! Звяртаемся мы да вас за дапамогай: паўплывайце на бракаробаў з завода меліярацыйных машын, што ў Мазыры.

Зрабілі тут нам на трактар «МТЗ-80» пад'ёмнік «ОПТ-9195». Тры месяцы цягнулі з выкананнем заказа, а выдалі брак: на працягу месяца 6 (!) разоў выходзілі са строю размеркавальнікі гідраўлікі.

Пазванілі мы на завод. Там паабяцалі, што прыедуць і выправяць непаладкі. Толькі ніхто і не думаў прыязджаць, а нас цешылі абяцанкамі.

Спачатку з горам папалам няспраўнасці ліквідоўвалі сваімі сіламі. А цяпер зрабіць гэтага не можам: раскалоўся гідраразмеркавальнік. Заўважце: гарантыю далі на 18 месяцаў! Хацелася б спытаць: каму патрэбна такая гарантыя, як і гэта халтура?

І яшчэ. Нам у саўгасе не патрэбна цацка, у якую мазырскія бракаробы пераварылі пад'ёмнік «ОПТ-9195». Нам трэба, каб гэты механізм працаваў.

Аляксандр КОЗЕЛ.

Саўгас «Прыпяцкі», Петрыкаўскі раён.

А кажуць, няма кватэр...

Паважаная рэдакцыя!

Да вас звяртаюцца жыхары дома № 23, корп. 1 па вул. Чкалава, што ў Віцебску. У 4-м пад'ездзе ўсе 36 кватэр займаюць будаўнікі Віцебскага ДБК. Гэта іх падсобныя і бытавыя памяшканні, так званыя «бытоўкі». Кватэры пад іх былі аддадзены ў часовае карыстанне, на перыяд забудовы мікрараёна «Поўдзень-5».

Забудова яго завершана больш чым 3 гады назад, але будаўнікі працягваюць займаць кватэры. Балюча глядзець, як яны абыходзяцца з жыллём, а туды ж у канчатковым выніку будуць заселены людзі. Кватэры неаднаразова заліваліся, у пакоях непралазны бруд, поўна прусакоў, якія пранікаюць і ў нашы кватэры. Ці ж можна так жыць далей?

Мы спадзяваліся, што пасля завяршэння аб'екта будаўнікі пойдуць. Але дагэтуль усё застаецца па-ранейшаму: кожную раніцу ля дома збіраецца натоўп, і на ўвесь двор шум, лаянка. Усё гэта чуюць дзеці. Яшчэ пад вокнамі заўсёды шмат грузавікоў, якія чадзяць так, што дыхаць нельга.

Мяркуем, што пасля столькіх гадоў жыцця сярод гэтага тлуму мы маем права на нейкі спакой. Але пытанне не вырашае Віцебскі гарвыканком, хоць мы неаднаразова звярталіся туды. Шчыра спадзяёмся на тое, што, можа, з дапамогай друкаванага слова яно будзе нарэшце вырашана.

Тым самым вы дапаможаце не толькі нам, але і будаўнікам Віцебскага ДБК, якім ад сваіх «бытовак» да рабочага месца і назад штодзённа даводзіцца адмяраць па некалькі кіламетраў.

З павагай
Р. Траяноўскі, Н. Забеліна, В. Дабрахотава, П. Цвердава і іншыя жыхары.
г. Віцебск.

Колькі каштуе сумленне?

Мой сябар-аднапалчанін, ветэран вайны і працы Васіль Пятровіч Вітрэнка, з якім мне давялося нядаўна сустрэцца, прыехаў са Смаленска. Пабывалі мы ў кінатэатры, музеі, наведалі могілкі, дзе пахаваны савецкія воіны, што загінулі пры вызваленні Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Госцю горад спадабаўся, як і адносіны гараджан да памяці тых, хто не вярнуўся з франтавых дарог.

Да адыходу цягніка заставалася некалькі гадзін, і мы вырашылі заглянуць на гарадскі рынак. Тут амаль заўсёды бываюць садавіна і агародніна, не пустуюць і мясныя рады. Праўда, цэны кусаюцца. Вось тут і адбылася сцэна, якая ўразіла нас, выклікала ў мяне абурэнне.

— Сынок, колькі просіш за кілаграм мандарынак? — пацікавіўся мой сябар.

— Баця, глядзі на цэннік і не задавай лішніх пытанняў, — рэзка адказаў малады чалавек і скоса паглядзеў на ордэнскія планкі на яго пінжаку.

— Бачу я дрэнна, сынок.

Прадавец назваў лічбу і пачаў назіраць, якое ўражанне яна зробіць на пакупніка. Цана была немаленькай.

— Можа, уступіш некалькі? — з слабай надзеяй спытаў ветэран. — Унукам трэба гасцінца прывезці.

— Калі цана не задавальняе, шукай таннейшай, — пачуў у адказ. — Я ж не вінаваты, што ў цябе пенсія маленькая. Калі б не так добра ваяваў, можа, жыў бы цяпер лепш.

У майго сябра, як ад удару ў твар, тарганулася галава, задрыжэлі вусны. Ён нічога не адказаў, толькі махнуў рукой і адышоў. А прадавец весела засмяяўся ўслед ветэрану. Маўляў, як я яго? Але падтрымкі ні ў кога не знайшоў. Хоць ніхто і не заступіўся за былога франтавіка. А мне падумалася: «Дзе ж, даражэнькі, ты так хутка страціў сваё сумленне?»

Што ж гэта атрымліваецца? Ордэны, медалі, перанесеныя некалі цяжкія раненні ўжо зусім не сведкі былой баявой славы і адвагі ветэрана, а прадмет насмешкі над імі. Вось чаму замест міласэрнасці, павагі ветэраны ўсё часцей сустракаюцца з грубасцю, нетактоўнасцю, незаслужанымі папрокамі і іншымі нядобрымі з'явамі, якія здольны прычыніць гэтым людзям душэўны боль.

Успомніце, калі апошні раз вы дапамаглі слабаму старому перайсці вуліцу або ўступілі месца састарэлай жанчыне ў перапоўненым аўтобусе? А можа, проста так вечарам зайшлі на агеньчык да пажылога франтавіка, душэўна пагутарылі з ім, падбадзёрылі цёплым словам? І ўсё гэта зрабілі, як гаворыцца, не па абавязку службы, а па загаду сэрца і сумлення?

На вялікі жаль, стала нямодным праяўляць міласэрнасць да тых, хто ў ёй мае вялікую патрэбу. У модзе цяпер іншае: уменне рабіць грошы. Няважна, што пры гэтым, вобразна кажучы, трашчаць косці ў тых, па чыіх галовах ідзе той або іншы малады «дзелавы» чалавек. Галоўнае для яго — вынік. Любой цаной.

Вось і хацелася б спытаць у такога дзялка, ці ёсць у яго сумленне? А калі крыху ўсё ж засталося, то колькі яно каштуе?

М. ІВАНОЎ, рабочы.

г. Гродна.

Вы прасілі дапамогі

Што і казаць, развялі валакіту з выкананнем заказу Надзеі Адамаўны Мяцко ў Салігорскім раённым камбінаце бытавога абслугоўвання. Больш года тут, як кажуць, вадзілі яе за нос, кармілі абяцанкамі.

Дырэктар РКБА А. СКРЫГАН паведаміў рэдакцыі, што заказ выкананы, дастаўлены на месца і Н. Мяцко прынесены прабачэнні.

У той жа час за дапушчаную валакіту работніца прыёмнага пункта, што знаходзіцца ў в. Першамайск, Т. Шкор пакарана ў дысцыплінарным парадку. Дыспетчару камбіната М. Верамейчык указана на пралікі ў работе.

***

Жыхарка з п. Леніна Горацкага раёна Л. Баравікова абралася ў пісьме, што цэлы месяц маўчаў яе кватэрны тэлефон, а майстар пад рознымі прычынамі адмахваўся ад патрабаванняў абанента.

Начальнік Горацкага раённага вузла сувязі М. МАРКОЎСКІ пацвердзіў, што тэлефон не працаваў з-за пашкоджання кабелю. Цяпер разрыў ліквідаваны, апарат працуе, а за час, што ён прастаяў без справы, будзе знята аплата.

А вось за няякаснае выкананне работ і нясвоечасовае выпраўленне пашкоджання віноўнік — электраманцёр сувязі Г. Раемскі пазбаўлены прэміяльнай аплаты.

І вельмі правільна. На рабоце трэба не лынды біць, а добрасумленна выконваць свае службовыя абавязкі.

РЭПАРТАЖ З ЦЭНТРА ЗАНЯТАСЦІ

ЧАЛАВЕК ШУКАЕ РАБОТУ...

АЛЕ ШАНЦУЕ ДАЛЁКА НЕ КОЖНАМУ

Тое, у што мы так доўга не маглі паверыць, на жаль, стала рэальнасцю. Сёння беспрацоўе (за якое наша прэса столькі «лупцавала» заходнія дзяржавы) завітала і да нас саміх. Пакуль што гэтых людзей, якія шукаюць і не могуць знайсці работу, параўнальна няшмат. Але хто захоча апынуцца на іх месцы! І што чакае нас заўтра!

Спачатку — трохі статыстыкі. З першага ліпеня мінулага года па першае студзеня сёлетняга ў Гродзенскі гарадскі цэнтр занятасці па пытаннях працаўладкавання звярнуліся 2.644 чалавекі, 21,4 працэнта з іх складаюць звольненыя ў сувязі са скарачэннем штатаў або ліквідацыяй прадпрыемства (прычым сярод іх 90 працэнтаў жанчын), 7 працэнтаў — выпускнікі ВНУ, тэхнікумаў і ПТВ, 30 — перасяленцы з Гомельшчыны і Магілёўшчыны...

Большасць наведвальнікаў у цэнтры даволі хутка працаўладкавалі. Аднак 340 чалавек атрымалі статус беспрацоўных (за паўгоддзе ім выплачана 112,6 тысячы рублёў) і толькі 30 працэнтаў ад гэтай колькасці да канца мінулага года ўсё ж знайшлі работу.

Сёлета сітуацыя яшчэ больш ускладняецца. За першы месяц года ў цэнтр звярнулася людзей у два разы больш, чым за той жа перыяд мінулага года. І многія з іх папоўнілі спіс беспрацоўных (гэты статус чалавек атрымлівае ў тым выпадку, калі праз два тыдні пасля звароту ў цэнтр занятасці яму так і не знайшлі работу).

А памятаеце лозунгі аб тым, што ў нашым грамадстве менавіта работа шукае чалавека! Зрэшты, яна і сёння яго шукае. На дошцы аб'яў цэнтра занятасці — дзесяткі паведамленняў аб вакансіях на розных прадпрыемствах Гродна. Тут і будаўнічыя арганізацыі, і аб'яднанні «Хімвалакно», прадзільна-нітачнае, тонкасуконнае... Невярагодныя, на першы погляд, лічбы: на пачатак сёлетняга года ў цэнтры зарэгістраваліся як не маючыя работы 1.017 чалавек, у той час як патрэбнасць у кадрах складала 1.445. Дык, можа, «ліпавае» ў нас беспрацоўе? Але справа ў тым, што па-ранейшаму адчуваецца дэфіцыт меніякіх больш-менш падыходзячых вакансій няма. Праўда, можна ўладкавацца швачкай на малое прадпрыемства ці вартаўніком у пазаведамасную ахову. Жанчыне ўсё гэта зусім не па спецыяльнасці, але і гэтыя варыянты яна не адхіляе і вырашае ісці па дадзеных адрасах, паколькі паўгадавы тэрмін выплаты дапамогі па беспрацоўю заканчваецца.

Асабліва шмат на ўліку ў цэнтры настаўнікаў, толькі сярод падапечных Е. Артуравай іх каля трыццаці. Тут і матэматыкі, і фізікі, і філолагі... Вось, напрыклад, Г. Клюева. Паўгода атрымлівала дапамогу па беспрацоўю, аднак работу па спецыяльнасці так і не знайшла. Калі тэрмін выплаты дапамогі скончыўся, вымушана была перакваліфікавацца ў швачку.

— Але самае небяспечнае,— лічыць Е. Артурава, — калі ў беспрацоўныя трапляюць тыя, хто яшчэ і не паспеў пачаць працоўны шлях.

Сяргей Вашкевіч звярнуўся ў цэнтр занятасці адразу пасля заканчэння ПТВ № 225, дзе атрымаў спецыяльнасць кухара. Як жа так здарылася?

— Накіраванне ў вучылішча мне далі з рэстарана, што на гродзенскім чыгуначным вакзале, — расказвае Сяргей, — туды ж я і павінен быў вярнуцца працаваць. Аднак пасля заканчэння вучобы мне ў рэстаране адмовілі, маўляў, я ім не патрэбны.

— А ці прапанавалі ў ПТВ іншае месца работы?

— Не.

— Ці ёсць жаданне працаваць па спецыяльнасці?

— Цяпер ужо не вельмі, шукаю іншую работу.

Ды і адкуль узяцца гэтаму жаданню, калі табе з першых жа крокаў ставяць такія вось «падножкі»? Прычым лёс Сяргея — не прыкрае выключэнне. Адразу пасля заканчэння таго ж ПТВ з верасня мінулага года атрымлівае дапамогу па беспрацоўю прадавец Наталля Шалік. Закончыўшы Гродзенскае кааператыўнае вучылішча, таксама ні дня не працавала навіта рабочых кадраў. Сярод жа тых, хто шукае работу, працэнтаў 70 — гэта ІТР і служачыя.

Вы можаце запярэчыць: маўляў, што перашкаджае чалавеку перавучыцца на тую ці іншую рабочую прафесію (у якой сёння ёсць патрэбнасць), тым больш, што ўсе арганізацыйныя і фінансавыя клопаты цэнтр занятасці бярэ на сябе? З адной рабочай спецыяльнасці на іншую людзі і сапраўды нярэдка перавучваюцца. Аднак зрабіць гэты крок настаўніку ці інжынеру, згадзіцеся, куды больш складана. Ды і ці па-дзяржаўнаму ставіць ля станка тых, каго доўгі час рыхтавалі зусім для іншага?

...Дзверы ў кабінет інспектара цэнтра занятасці Е. Артуравай амаль не зачыняюцца. Гутарым з чарговай наведвальніцай. Працавала ў адным з інфармацыйна-вылічальных цэнтраў, трапіла пад скарачэнне і вось ужо колькі разоў з надзеяй звяртаецца да Евы Аляксандраўны. І зноў безвынікова, можа, ўладкавацца швачкай на малое прадпрыемства ці вартаўніком у пазаведамасную ахову. Жанчыне ўсё гэта зусім не па спецыяльнасці, але і гэтыя варыянты яна не адхіляе і вырашае ісці па дадзеных адрасах, паколькі паўгадавы тэрмін выплаты дапамогі па беспрацоўю заканчваецца.

Асабліва шмат на ўліку ў цэнтры настаўнікаў, толькі сярод падапечных Е. Артуравай іх каля трыццаці. Тут і матэматыкі, і фізікі, і філолагі... Вось, напрыклад, Г. Клюева. Паўгода атрымлівала дапамогу па беспрацоўю, аднак работу па спецыяльнасці так і не знайшла. Калі тэрмін выплаты дапамогі скончыўся, вымушана была перакваліфікавацца ў швачку.

— Але самае небяспечнае,— лічыць Е. Артурава, — калі ў беспрацоўныя трапляюць тыя, хто яшчэ і не паспеў пачаць працоўны шлях.

Сяргей Вашкевіч звярнуўся ў цэнтр занятасці адразу пасля заканчэння ПТВ № 225, дзе атрымаў спецыяльнасць кухара. Як жа так здарылася?

— Накіраванне ў вучылішча мне далі з рэстарана, што на гродзенскім чыгуначным вакзале, — расказвае Сяргей, — туды ж я і павінен быў вярнуцца працаваць. Аднак пасля заканчэння вучобы мне ў рэстаране адмовілі, маўляў, я ім не патрэбны.

— А ці прапанавалі ў ПТВ іншае месца работы?

— Не.

— Ці ёсць жаданне працаваць па спецыяльнасці?

— Цяпер ужо не вельмі, шукаю іншую работу.

Ды і адкуль узяцца гэтаму жаданню, калі табе з першых жа крокаў ставяць такія вось «падножкі»? Прычым лёс Сяргея — не прыкрае выключэнне. Адразу пасля заканчэння таго ж ПТВ з верасня мінулага года атрымлівае дапамогу па беспрацоўю прадавец Наталля Шалік. Закончыўшы Гродзенскае кааператыўнае вучылішча, таксама ні дня не працавала Людміла Будзько.

Нямала ў цэнтры на ўліку і дзяўчат з сярэдняй будаўнічай адукацыяй — тэхнікаў, прарабаў. Гэта тым больш дзіўна, што менавіта на будоўлях сёння найбольшая колькасць кадравых вакансій.

— Аднак дзяўчат там на работу браць не хочуць,— канстатуе Е. Артурава. — Магчыма, гэта і сапраўды не жаночая справа. Аднак калі існуюць праблемы з працаўладкаваннем выпускніц, хіба можна гэта не ўлічваць, рыхтуючы ў тэхнікуме будаўнічыя кадры?

На жаль, у большасці навучальных устаноў зусім не хвалюцца аб тым, якія менавіта кадры і колькі іх сёння патрабуецца. А можа, і не трэба нам выпускаць столькі настаўнікаў, калі многія з іх трапляюць у беспрацоўныя? Можа, у асобных ПТВ колькасць навучэнцаў трэба зменшыць, а ў некаторых, наадварот, павялічыць? Словам, тут проста напрошваюцца адпаведныя сацыялагічныя даследаванні.

Аднак далёка не ўсе наведвальнікі цэнтра занятасці выклікаюць спачуванне. Нядаўна, напрыклад, да Е. Артуравай завіталі двое маладых мужчын.

— Нам бы вартаўнікамі ў дзіцячы садок уладкавацца, — заявілі яны.

Хутка высветлілася, што іх «стыхія» — рэчавы рынак, там яны робяць свой бізнес. Навошта ж спатрэбіўся яшчэ і дзіцячы сад? Справа ў тым, што работа там не зойме шмат часу і сіл, плюс яшчэ гарантуе пэўную колькасць купонаў. Словам, цудоўнае прыкрыццё для асноўных заняткаў.

Дарэчы, 29 зарэгістраваным у цэнтры беспрацоўным выплату дапамогі... прыпынілі.

— Я разумею так, што калі чалавек сапраўды трапіў у бяду, страціў работу, — лічыць дырэктар цэнтра занятасці Л. Рэз, — дык ён выкарыстае ўсе магчымасці для таго, каб усё ж працаўладкавацца, нават не па спецыяльнасці. Ну, а гэтым людзям мы двойчы прапаноўвалі даволі блізкую да іх ранейшых заняткаў работу або пераабучэнне — яны адмовіліся.

Не выключана, што сярод іх таксама былі тыя, для каго статус беспрацоўнага быў зручным прыкрыццём і дазваляў атрымліваць дадатковыя сродкі. У гэтай сувязі яшчэ адзін факт для роздуму. Здавалася б, беспрацоўны павінен выкарыстоўваць любую магчымасць зарабіць грошы. Аднак, як сведчыць Л. Рэз, рэдка хто з іх адгукаецца на прапанову ўдзельнічаць у сельскагаспадарчых і іншых грамадскіх работах. Відаць, пакуль можна яшчэ асабліва і не перанапружвацца. Але што іх чакае заўтра?

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«Глянем на гісторыю вачыма беларуса»

— Па якіх падручніках вывучаюць сённяшнія студэнты гісторыю Беларусі?

— Новых падручнікаў няма, і, відаць, яны не хутка з'явяцца. Робім упор на лекцыі. Зразумела, выкладаецца цяпер гісторыя з зусім іншых пазіцый, чым яшчэ некалькі гадоў назад. Гэта не значыць, што мы рэзка памянялі погляды: большасць выкладчыкаў і раней не здраджвалі гістарычнай праўдзе. Іншая справа, што не было магчымасці выкладаць студэнтам сваю пазіцыю, адрозную ад афіцыйнай.

Думаем над тым, каб выдаць курсы лекцый, дапаможнікі па вузкіх тэмах, практыкумы, — і хоць такім чынам крыху палегчыць складанае становішча з падручнікамі.

— Яшчэ зусім нядаўна галоўнай дысцыплінай на любым гістфаку быў курс гісторыі СССР. Што прыйшло на змену гэтаму прадмету?

— Сапраўды, да апошняга часу стрыжнем гістарычнай адукацыі была гісторыя СССР. У планах, якія мы атрымлівалі з Масквы, гісторыя Беларусі нават не значылася: меркавалася, што яна між іншым разглядаецца ў ліку «дысцыплін, звязаных з асаблівасцямі рэспублікі»,— разам з нумізматыкай, краязнаўствам і г. д. На ўсе гэтыя курсы, якія датычылі спецыфікі Беларусі, адводзілася крыху больш як 200 гадзін. На гісторыю СССР — каля 600 гадзін.

Цяпер на гісторыю Беларусі колькасць гадзін мы давялі да 300, на гісторыю СССР — 390. Паступова гэтыя суадносіны будуць рэзка змяняцца на карысць гісторыі нашага краю. Акрамя таго, на наступны навучальны год мы расшыраем колькасць і аб'ём дысцыплін, звязаных з гісторыяй Беларусі. Студэнты будуць вывучаць гісторыю беларускай культуры, літаратуры, этнаграфію, археалогію, магчыма — гістарычную геаграфію Беларусі. За кошт чаго будуць уводзіцца гэтыя дысцыпліны? У першую чаргу за кошт палітычнай гісторыі, ад якой мы вырашылі ўвогуле адмовіцца: для гістфака гэты курс не патрэбен, ён дублёруе іншыя дысцыпліны.

Такім чынам, курс гісторыі Беларусі з наступнага года стане стрыжнем гістарычнай адукацыі ў нашым універсітэце.

Што ж датычыць гісторыі СССР, Расіі, — то мы будзем вывучаць яе ў рамках усеагульнай гісторыі, — як і гісторыю іншых суседніх дзяржаў, — Украіны, Польшчы, краін Прыбалтыкі, — якім мы мяркуем надаць значна больш увагі, чым гэта было да апошняга часу.

Але галоўная наша задача — гісторыя Беларусі на фоне сусветнай гісторыі.

— Наколькі шырока сёння на факультэце ў выкладанні выкарыстоўваецца беларуская мова?

— Два гады назад мы першымі ва універсітэце стварылі беларускамоўнае аддзяленне. Успрынята тады гэта было неадназначна, але паступова справа наладзілася. У перспектыве беларускамоўным стане ўвесь факультэт. А пакуль, працуючы са студэнтамі беларускага аддзялення, выкладчыкі набіраюцца вопыту.

Дарэчы, новае аддзяленне,— архівазнаўства і музеезнаўства, якое адкрыецца ў новым навучальным годзе, — з самага пачатку стане беларускамоўным.

Пераход на беларускую мову, мне здаецца, будзе не такім ужо хваравітым, як мы апасаліся. Прынамсі, сёння ўжо ніхто не ўспрымае ў штыкі «беларусізацыю». Для жадаючых працуюць курсы беларускай мовы, якія, дарэчы, я і сам наведваю.

— Ці здольныя, на вашу думку, тыя выкладчыкі, якія ўчора выкладалі гісторыю папрасійску, сёння даносіць яе да студэнтаў інакш? Ці мяркуеце вы ў сувязі з гэтым абнаўляць кадры?

— Думаю, большасці з нас пазіцыю не трэба мяняць — яна была вызначана даўно і надоўга, хоць гэта і нельга было да пары да часу афішываць. Прыкра, што ў многіх склаўся аб гісторыках стэрэатып як аб людзях, гатовых ісці на амбразуру дзеля марксісцкіх ідэалаў.

Цяпер нам стала лягчэй працаваць, бо, ідучы ў аўдыторыю, мы гаворым не тое, што камусьці трэба, а тое, што думаем.

Сярод маіх калег, «грамадзянскіх» гісторыкаў, няма людзей, перад кім востра стаяла б гэта праблема — змены светапогляду, ідэалагічных падыходаў. Таму «ператрэсваць» кадры, па-мойму, няма ніякіх падстаў. Праблема зусім у іншым.

Дарэчы, па маіх назіраннях, сярод гісторыкаў колькасць кансерватыўна настроеных людзей намнога меншая, чым у цэлым у грамадстве. Тлумачыцца гэта проста: нам даўно былі вядомы факты, якія для большасці адкрыліся толькі ў апошнія гады. (Маю на ўвазе гісторыкаў «грамадзянскіх», не «партыйных», пра якіх мне мала вядома).

— Увесь савецкі перыяд мы глядзелі на гісторыю свету вачыма маскоўскіх гісторыкаў, бо вучыліся па іх падручніках. Ці выпрацоўваецца цяпер беларускі погляд на сусветную гісторыю?

— Такі погляд неабходны,— але яго пакуль што няма. Любы народ, любая суверэнная дзяржава, якія паважаюць сябе, ацэньваюць гістарычныя падзеі з пункту гледжання сваіх інтарэсаў. Мы ж увесь апошні час карысталіся і карыстаемся падручнікамі, якія напісаны і выдадзены ў Маскве. Хоць зусім відавочна, што многія падзеі і ў нядаўняй, і ў далёкай гісторыі з Масквы і з Мінска бачны ў зусім розным святле. Дастаткова прыгадаць рускапольскія войны, падзелы Рэчы Паспалітай, бітву пад Ведрэшам 1500 года і пад Оршай 1514 года, Брэсцкі мір... На жаль, каб стварыць уласныя падручнікі, спатрэбіцца вельмі многа часу і сіл. А спецыялісты па сусветнай гісторыі сканцэнтраваны пераважна на нашым факультэце. Ды і іх нямнога. Так што і тут давядзецца з падручнікамі пачакаць, абыходзячыся пакуль што лекцыямі.

Увогуле, праблем перад гісторыкамі столькі, што вырашыць іх можна, толькі аб'яднаўшы намаганні. Што мы і збіраемся зрабіць у недалёкай будучыні: наш факультэт выступае з ініцыятывай правядзення канферэнцыі гісторыкаў Беларусі па праблемах гістарычнай адукацыі і навукі ў рэспубліцы.

— Ці няма, на вашу думку, пагрозы таго, што ў выкладанні гісторыі ўслед за эпохай «аднадумства» можа надысці час такога ж «аднадумства», толькі з супрацьлеглым знакам?

— Гарантый, што гэтага не адбудзецца, даць, зразумела, нельга. Але сёння мы робім усё дзеля таго, каб час, калі на гістарычныя падзеі нельга было мець розныя пункты гледжання — не вярнуўся. Любы гісторык Беларусі з любымі поглядамі на гістарычныя падзеі можа прыйсці да нас на факультэт і выступіць перад аўдыторыяй. Мы гатовы ўспрыняць любую пазіцыю. Шлях да ісціны не можа быць іншым.

Валянцін ЖДАНКО.

Яшчэ зусім нядаўна гэта быў адзін з самых ідэалагізаваных факультэтаў Беларускага універсітэта. Ні адна курсавая ці дыпломная работа, ні адзін рэферат ці даклад тут не маглі абысціся без зубадрабільных, да месца і не да месца, — спасылак на класікаў марксізму-ленінізму, без выверанай ідэйнай лініі, без рацыянраванай ісціны і неабмежаванага словаблудства. І самы вялікі парадокс: на гістарычным факультэце галоўнага універсітэта Беларусі пра беларускую гісторыю студэнт даведваўся намнога менш, чым пра гісторыю суседніх дзяржаў. Ды і тыя звесткі, якія даваліся, часта былі замешаны на паўпраўдзе.

Што цяпер адбываецца на гістарычным факультэце БДУ? Якую гісторыю, якія пункты гледжання на яе тут выкладаюць студэнтам? Да якой канцэпцыі гістарычнай адукацыі схіляюцца? Пра гэта — гутарка з дэканам гістфака БДУ кандыдатам гістарычных навук Пятром Шупляком.

Дэканам Пётр Аляксеевіч выбраны ў канцы мінулага года. Да гэтага доўгі час працаваў намеснікам дэкана гэтага ж факультэта.

Вобласць навуковых інтарэсаў цяперашняга дэкана — праблемы германскай гісторыі, у прыватнасці — перыяду Веймарскай рэспублікі, які П. Шупляк даследаваў пад час навучання ў ГДР.

ЭКАНАМІЧНЫ АГЛЯД

Плюс—нуль цэлых тры дзесятых

Магчыма, зусім не час каменціраваць вынікі работы народнай гаспадаркі рэспублікі ў леташнім годзе: пазнавата (хоць, зрэшты, адпаведныя дзяржкамстатаўскія звесткі атрымалі зусім нядаўна), ды і сітуацыя ўжо некалькі іншая — у сувязі з той жа лібералізацыяй... І тым не менш аглянуцца на мінулы год, напэўна, не шкодзіць. Па-першае, ужо хоць бы з прычыны яго сумнай унікальнасці, калі мець на ўвазе спаўзанне ў ім эканомікі ўніз, а па-другое, з тым, каб з «вышыні» гэтых вынікаў паглядзець і на эфектыўнасць той жа лібералізацыі. А ў сувязі з гэтым ужо адразу варта заўважыць: падзенне эканамічных паказчыкаў практычна пачалося пасля першай «лібералізацыі» — паўлаўскай, можна нават гаварыць тут аб нейкай сінхроннасці... Хоць, вядома, могуць быць і супадзенні, ды і колькі іншых узрушэнняў адбылося на калісьці адзінай эканамічнай прасторы...

Аднак што канкрэтна мы мелі на зыходзе шостага года перабудовы?

Як ні дзіўна (калі ўлічваць усе тыя разбуральныя сілы, якія ўздзейнічаюць на эканоміку, і асабліва ў апошні час), работа беларускіх прадпрыемстваў у канцы года некалькі выраўнавалася — пасля прыкметнага спаду ў першым паўгоддзі. Вядома, гэта станоўчы факт. І тым не менш па абсалютнай большасці эканамічных паказчыкаў не дасягнуты нават пазалеташні ўзровень. У прыватнасці, зніжана колькасць валавога нацыянальнага прадукту, зменшыўся выраблены нацыянальны даход, мінусуе прадукцыя прамысловасці... Хіба па таварах народнага спажывання выйшлі на плюс — на 100,3 працэнта. Так, усяго толькі. Такое вось дасягненне. Пры гэтым улічым, пры якіх абяцаннях і заклінаннях на ўсіх узроўнях, у тым ліку і ўрадавых, дасягнуты гэтыя нуль цэлых тры дзесятых. Улічым, каб канчаткова засвоіць: аднымі заклінаннямі не выцягнем, свой дабрабыт не палепшым.

І не насыцімся. У прамым сэнсе. Асабліва напружанае становішча склалася менавіта з вытворчасцю прадуктаў харчавання. І асабліва ў канцы года. У параўнанні з 1990-м, таксама далёка не лепшым годам, —збавілі больш як на 9 працэнтаў. Нягледзячы на тую павышаную ўвагу да сельскай гаспадаркі, якую выказвала рэспубліка летась, справы тут па-ранейшаму ідуць пад ухіл. У прыватнасці, працягваецца скарачэнне пагалоўя жывёлы, што, вядома, вядзе да рэзкага змяншэння жывёлагадоўчай прадукцыі, адпаведным чынам адбіваючыся на запоўненасці гандлёвых паліц. Летась у параўнанні з пазалеташнім годам у гандаль паступіла намнога менш мяса і птушкі (на 15 працэнтаў), масла — на 14 і г. д. І гэта нягледзячы на скарачэнне паставак у агульнасаюзны фонд. Карацей, цяпер нам прыходзіцца нават не той жа, ранейшы, а намнога меншы кавалак дзяліць на большую колькасць ратоў.

Зрэшты, не ўсё так сумна ў афіцыяльных звестках: прынамсі, вытворчасць алкагольных напіткаў няўхільна расце — 120,9 працэнта за год. Нават не зважаючы на недахоп шклары. Праўда, невядома, як будзе далей. Струмень, які з аднолькавым поспехам наталяў як смагу многіх суграмадзян, так і апетыты бяздоннага бюджэту, няйначай, перакрыюць — з дапамогай акцызнага падатку. Бюджэту, як заўсёды, хочацца ўзяць як мага больш. Цераз той жа падатак. І, напэўна, возьме. Адразу. А потым раптам убачым, што браць ужо няма чаго. Як гэта неаднойчы ўжо было.

Аднак што яшчэ стала асаблівым дэфіцытам на канец года?

Да тавараў мы яшчэ вернемся, а зараз скажам пра прадукты нафтаперапрацоўкі. У гэтай галіне найбольш рэзкае падзенне — у сувязі са значным скарачэннем паставак нафты. І гэта з асаблівай вастрынёй ставіць на першы план праблему паліва.

Напэўна, няшмат радасці і адпаведных «дачных» перспектыў прынясе для чытача і паведамленне Дзяржкамстата наконт вынікаў работы прадпрыемстваў лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці, а таксама прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і, адпаведна, канстатацыя наступнага факта: летась продаж піламатэрыялаў, аконных і дзвярных блокаў, садовых домікаў скараціўся на 52—69 працэнтаў, шыферу, дзелавой драўніны, фанеры кленай, аконнага шкла — на 20—32...

Дарэчы, не ўсё сярод гэтых зніжэнняў нясе адмоўныя вынікі. Асмелюся сцвярджаць, што, напрыклад, рэзкае падзенне вытворчасці вылічальных машын і кіруючых комплексаў (на 62 працэнты) толькі на нашу ж агульную карысць. Па той простай прычыне, што не бяруць гэтыя комплексы, і калектыў Мінскага аб'яднання вылічальнай тэхнікі даўно ўжо паспяхова працуе на склад, а дакладней — на свой, заводскі двор. Між іншым, Дзяржкамстат не паведамляе, а вельмі хацелася б пачуць, што рэзка знізіла выпуск сваёй прадукцыі (робататэхнікі) і аб'яднанне «Гранат». Гэтыя паведамленні азначалі б, што мы на самай справе сталі эканоміць такія дэфіцытныя цяпер для нас матэрыяльныя рэсурсы.

Але вернемся да тавараў. І параўнаем іх леташнюю вытворчасць (у прыватнасці, тавараў лёгкай прамысловасці) з вытворчасцю 1985 года, як зрабіў гэта цяпер Дзяржкамстат... Увогуле, нядрэнна жывём, па асобных, хоць і даволі рэдкіх пазіцыях, — нават рост. Дасягненні перабудовы наяве... Хоць тавараў, вядома, няма. Ды і адкуль ім узяцца, калі ў лёгкай прамысловасці тая ж з'ява — падзенне вытворчасці. І як бы нам у хуткім часе, з тым каб вывесці станоўчае сальда (хоць па асобных пазіцыях), не давялося браць для параўнання больш аддаленае мінулае? Хоць, зрэшты, параўнаць з тым жа 1985-м іншы раз не шкодзіць.

Статыстыка таксама зафіксавала, што «некалькі палепшылася становішча з вытворчасцю бытавой тэхнікі працяглага карыстання». Варта дапоўніць: гэтая тэхніка, бадай, адзіная захоўвала на працягу года «плюс». Праўда, бясспрэчна і іншае: пры існуючых тэмпах выпуску гэтай тэхнікі, а таксама тэмпах перапрафіліравання на яе выпуск прадпрыемстваў ВПК — насычэння рынку не адбудзецца.

А ўвогуле цікавую з'яву мы цяпер наглядаем: дэфіцыт пры вольных цэнах. (Дарэчы, гандлёвы абарот летась, у супастаўных цэнах, склаў 99,5 працэнта да пазалеташняга.) Вывад напрошваецца адзіны: няйначай, яны стануць яшчэ больш вольнымі... Вядома, калі вытворчасць будзе напаўняць гандлёвыя паліцы такімі ж тэмпамі, як робіць гэта цяпер. Калі структурныя зрухі ў прамысловасці будуць заканчвацца аднымі размовамі. Калі не дойдзе да сапраўдных прыватызацыі і фермерства, да з'яўлення класа прадпрымальнікаў і вызвалення дзяржавы ад неўласцівых для яе гаспадарчых функцый...

Мы захраслі на паўдарозе (і нават не на паўдарозе, а на пачатку шляху) да рынку. Адмовіліся ад камандна-адміністрацыйнай сістэмы (якая хоць і з вялікімі для грамадства выдаткамі, ды ўсё ж забяспечвала пэўны баланс), але таму ж рынку не прысягнулі яшчэ. Прыватызацыю аб'явілі, а па сутнасці не браліся за яе. Дарэчы, тая ж лібералізацыя — гэта далёка не рынак. Яна проста абмяжуе нашы запатрабаванні і створыць ілюзію дастатку, напаўнення. Лібералізацыя ў тых умовах, калі мы маем манапалізаваны дзяржаўны сектар, не прывядзе да адэкватнага росту вытворчасці... А да ўсяго мы яшчэ толкам і не вызначыліся, зрэшты, дзе знаходзімся, — ці то ў Садружнасці, ці ў вольным плаванні... Такі падвешаны стан крайне небяспечны, ён пагражае яшчэ большай нестабільнасцю і спадам у эканоміцы. Ужо першы месяц года сведчыць аб неспрыяльных тэндэнцыях: з-за парушаных сувязей і, адпаведна, адсутнасці сыравіны прастойваюць многія прадпрыемствы, людзей адпраўляюць у вымушаны водпуск (на Мінскім аўтазаводзе нават перайшлі на рабочую чатырохдзённу)...

А пры гэтым зноў-такі дае аб сабе знаць стратная эканоміка. Такі цікавы для характарыстыкі нашага рыначнага мыслення факт: у той час, калі мы маем такую напружанасць з матэрыяльнымі рэсурсамі, — усяго на 40 працэнтаў забяспечаны збыт плануемай да выпуску прадукцыі (маецца на ўвазе заключэнне адпаведных дагавораў). Выдатна: спачатку выпусцім, а потым будзем прыладжваць. А ці тое, што мае востры попыт, дае прыбытак, аддачу, запланавалі выпускаць, калі дагаворы не «ідуць»?

Аднак не расцягнуць бы нам празмерна г

РОЗГАЛАС

ЭКСПРЭС-АПЫТАННЕ

УСЕ НА БАРАЦЬБУ З «ПАРНУХАЙ»!

У сувязі з распаўсюджаннем кіна-відэа-друкаванай і іншай прадукцыі, якая прапагандуе парнаграфію, культ насілля і жорсткасці, абражае чалавечы гонар і спрыяе розным правапарушэнням, асабліва сярод дзяцей і моладзі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову «Аб мерах па стрыманню прапаганды парнаграфіі, культу насілля і жорсткасці». А што з гэтай нагоды думаюць зацікаўленыя асобы? Мы звярнуліся да людзей, якія так ці інакш сутыкаюцца з «парнаграфіяй і культам насілля і жорсткасці».

Сяргей, работнік відэасалона «Пяшчота»: Упершыню аб гэтай пастанове даведаўся з газеты «Вячэрні Мінск». Напэўна, гэта проста чарговая кампанія па барацьбе з «чымсьці», якая завершыцца беспаспяхова. Памятаеце, нешта падобнае выдавалася ўжо і пры Прэзідэнце Гарбачове? Але пасля гучнага абмеркавання ў друку гарбачоўскі ўказ так і застаўся пустым гукам. Нават, наадварот, працягваўся росквіт «парнухі» і насілля на экранах. Ды і наогул, я не лічу, што прадукцыя нашага відэасалона з'яўляецца вельмі ўжо крымінальнай.

Генадзь Л. (гандлюе насценнымі календарамі з «жанчынамі» і «баевікамі» ў падземным пераходзе метро): Ніколі не чуў аб падобных мерах беларускага Вярхоўнага Савета. Нават калі і ёсць такія, я ад гэтага нічога не страчу. Сёння гандлюю сваімі календарамі на людзях, заўтра, калі забароняць, пачну гандаль «з-пад палы». Усё роўна пакупнікі знойдуцца. Асабліва хлопцы.

Лідзія Міхайлаўна, кіяскёр: Нас столькі гадоў трымалі ў рамках «маральнага кодэкса будаўніка камунізму», што зараз наўрад ці гэта пастанова дасягне сваёй мэты. Трэба, пэўна, «перахварэць» цягай да «забароненага плода», і потым ўсё стане на сваё месца. Дарэчы, пастанова прадугледжвае стварэнне пры ўсіх упраўленнях культуры абласных і Мінскага гарадскога выканкомаў экспертных камісій з высокакваліфікаваных спецыялістаў для ацэнкі кіна-відэа-друкаванай прадукцыі. Таму я баюся аднаго — як бы сярод гэтых экспертаў не аказаліся малакампетэнтныя людзі, ханжы ці, наадварот, «вельмі добрыя».

КУРАНЯТЫ Ў ХМЫЗНЯКУ

Недалёка ад Пінска, у кустах, знойдзена свежая мясная звалка: хтосьці выкінуў дзевяць скрынак з куранятамі. Стандартная вага кожнай скрынкі — 30 кілаграмаў. На этыкетках — знак Пінскага мясакамбіната. Але сляды атрымальніка і згубіцеля дэфіцытнага прадукта трэба будзе ўстанаўліваць пракурору: як-ніяк, а тры цэнтнеры мяса, зусім нялішняга на дамашніх сталах, згінулі.

ХМЯЛЬНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

У жорсткіх умовах апынуліся ў гэтым годзе півавары Брэсцкага камбіната безалкагольных напіткаў.

Манаполію на хмель трымае Украіна, а кошт адной тоны сыравіны ўзрос з 17—22 тысяч рублёў да 200 тысяч. Ды яшчэ на апошніх таргах у Вінніцкай вобласці беларускіх гаспадарнікаў ледзь не пакінулі ні з чым прыбалты, якія прапанавалі па 400 тысяч рублёў за тону, прычым абавязаліся таксама забяспечыць украінскіх калгаснікаў абуткам, халадзільнікамі, тэлевізарамі ды іншым дэфіцытам. Брастаўчане ж маглі прапанаваць толькі рублі, за якія, як вядома, у нашых паўднёвых суседзяў можна атрымаць, прабачце, і па мордзе... Таму былі рады і пяці тонам хмелю, за якія выклалі адзін мільён 200 тысяч рублёў.

А між тым, калісьці хмель вырошчвалі і ў самой Брэсцкай вобласці. Магчыма, нехта з тутэйшых фермераў скарыстае шанц стаць мільянерам?

Лявон МУХАВЕЦКІ, БелаПАН.

АФІЦЭРУ ХАЦЕЛАСЯ КУРЫЦЬ

КАЛІНКАВІЧЫ. Мы ўжо неаднаразова расказвалі аб тым, як асобныя дэзерціры Савецкай Арміі і радавыя тэрміновай службы неаднаразова ўзломлівалі ўначы магазіны і забіралі ўсё, што ім падабалася. Праўда, у асноўным гэта былі прадукты харчавання, бо, як яны тлумачылі, вельмі есці хацелася.

А вось кадраваму афіцэру, старшаму лейтэнанту М. Віхараву, мяркуючы па ўсім, у адзін з апошніх дзён студзеня вельмі захацелася закурыць і выпіць. Ноччу, у 1.55 ён разбіў шкло ўваходных дзвярэй магазіна №14 у вёсцы Бобравічы і забраў 30 пачак цыгарэт «Сталічныя» і заадно прыхапіў тры бутэлькі гарэлкі. Дзейнічаў пры гэтым спакойна і рашуча, як і належыць афіцэру.

У. ПЕРНІКАЎ.

НОВЫ СПОСАБ РАЗМЕРКАВАННЯ?..

ЗЭЛЬВА (**А. Дук**). Гуманітарнай дапамогай Захаду зараз ужо нікога не здзівіш. Таму іншаземны фургон, які прыбыў з такой дапамогай у пасёлак, напачатку нікога з жыхароў не зацікавіў. Але ўсё самае дзіўнае было наперадзе...

Прахожыя былі шакіраваны, калі ўбачылі, як з адчыненых дзвярэй фургона на зямлю пачалі падаць садавіна, ласункі, адзенне і абутак. Найбольш спрытныя схапілі па некалькі рэчаў, штурхаючы адзін аднаго. А дабрачынцы тым часам здымалі незвычайнае відовішча на фота- і кінастужкі.

Невядома, чаму такім чынам немцы размяркоўвалі дапамогу. Мабыць, імкнуліся даказаць беспадстаўнасць слоў Старшыні парламента Беларусі С. Шушкевіча, які казаў, што такая дапамога нам не патрэбна? А можа іншаземцы апасаліся, што дапамогу не атрымаюць простыя людзі? Але навошта тады здымкі?

«ХОЧАМ ПРАЦАВАЦЬ, А НЕ ЖАБРАВАЦЬ...»

Паходзіш, паслухаеш, аб чым размаўляюць у чэргах, у грамадскім транспарце — і не пазайздросціш нашаму ўраду: як разумееце, слоў удзячнасці ў адрас апошняга ў народа на сённяшні дзень ужо няма. «Давялі да ручкі!» — так у асноўным характарызуецца і дзейнасць беларускага парламента.

Хацелася б, канешне, з імі не згадзіцца, але, як кажуць, факты — упартая рэч. Тое становішча, якое на жаль, складваецца сёння на прадпрыемствах рэспублікі, пацвярджае занепакоенасць мас у адносінах будучага, светлым якое, нават з вялікай нацяжкай, не назавеш. Шмат прадпрыемстваў працуюць нерытмічна, з перапынкамі. Іржа, якая раз'ядае нашу прамысловасць,— адсутнасць наладжанага забеспячэння камплектуючымі.

Мікалай Мікалаевіч Панарад, намеснік старшыні прафкома электратэхнічнага завода імя Казлова:

— Мы сёння вымушаны адпраўляць людзей у неаплачваемы адпачынак. Увесь студзень на заводзе стаялі два асноўныя выпускаючыя цэхі — 9-ы і 11-ы. Так што разумееце, якая сёння на электратэхнічным склалася абстаноўка. Перспектыва запрацаваць на поўную магутнасць, паводле нашых прагнозаў, пераносіцца аж на красавік. Пазаўчора на заводзе з гэтай нагоды адбыўся мітынг. Рабочыя, убачыўшы, што ўрад на сённяшні дзень не прымае, на наш погляд, практычных мер па наладжванню эканамічных сувязей з партнёрамі ў іншых дзяржавах Садружнасці, прынялі зварот да Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Калі справы будуць рухацца так і надалей, нам нічога не застанецца рабіць, як выйсці на плошчу і патрабаваць адстаўкі недзеяздольных урада і парламента. Мы хочам працаваць, а не жабраваць, сказаў М. Панарад.

Такое ж становішча і на адным з флагманаў беларускай індустрыі — Мінскім аўтамабільным заводзе. Учора, як паведамілі нам на заводзе, прадпрыемства стаяла з-за адсутнасці камплектуючых дэталей.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

БелаПАНарама

ТЫЦЫЯН—ПРЫХІЛЬНІК БЕЛАРУШЧЫНЫ?

Вялікі Тыцыян свой «Партрэт шляхціца» пісаў з Мікалая Радзівіла Чорнага, Берасцейскага старасты XVI стагоддзя. Да такой сенсацыйнай высновы прыйшла выкладчыца выяўленчага мастацтва Брэсцкага педагагічнага інстытута І. Б. Лаўроўская. Пацвярджэнне таму — геральдычны знак на партрэце, які ўваходзіў у герб Берасцейскага ваяводства.

Такому нечаканаму адкрыццю ёсць і дакументальнае абгрунтаванне. Так, літаратурныя крыніцы сведчаць, што ў 1547 годзе Мікалай Радзівіл Чорны прыязджаў у Аўгсбург да імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі і караля Іспанскага Карла V. У гэты ж час у Аўгсбургу па запрашэнню Карла V жыў і вялікі мастак. Яны сустракаліся пры двары і, магчыма, будучы Берасцейскі стараста мог пазіраваць Тыцыяну. Партрэт быў скончаны ў 1550 годзе, годам пазней пасля таго, як Мікалай Радзівіл Чорны стаў Берасцейскім старастам.

Рыгор ПАЛЯШУК.

І ДАМЫ—САВЕТАМ?

4 лютага ў Лідзе пачалася чарговая сесія гарсавета. Адно з пытанняў яе парадку дня — далейшы лёс будынка былога гаркома КПБ.

Раней спецыяльна створаная камісія рэкамендавала перадаць яго пад музычную школу і музвучылішча, якія пакуль месцяцца ў будынках амаль ці не аварыйнага стану. Аднак гарвыканком вырашыў, што ў прыстанак ранейшай улады павінна перабрацца ўлада новая — Савет народных дэпутатаў горада.

Чатыры дні з плакатамі ля гарсавета стаялі дзеці з музычнай школы. А ў першы дзень работы сесіі пікетаванне правяла «Дэмакратычная рада», у якую ўваходзяць прадстаўнікі стачкомаў і мясцовых арганізацый палітычных партый і рухаў Беларусі. Яны патрабуюць перадачы будынка былога гаркома кампартыі дзецям.

Л. АЛЯКСАНДРАЎ.

ЗАГАДКАВАЕ. НЕВЕРАГОДНАЕ. ФАНТАСТЫЧНАЕ?

Нябеснае пасланне славянам?

Прыкладна тры гады назад у многіх перыядычных выданнях з'явіліся сенсацыйныя паведамленні аб загадкавых з'явах, што назіраліся ў небе над горадам Сальскам.

Вось што пісала ў той час, напрыклад, мясцовая газета «Комсомолец»:

«Паводле сведчанняў відавочцаў загадкавых з'яў, на месцы прызямлення НЛА быў знойдзены наручны гадзіннік з пажоўклым цыферблатам. У Растове яго старанна даследавалі, у тым ліку і экстрасенсорным спосабам. Вывад быў адназначны: гадзіннік падвергнуты моцнаму энергетычнаму ўздзеянню, і яго біяполе нясе ў сабе адмоўны зарад — забірае энергію ў чалавека. Відаць, гэтым тлумачыўся той сонны стан людзей, у кватэрах якіх потым пабываў гадзіннік.

А цуды працягваюцца! Дзесяткі жыхароў горада на працягу верасня і першай палавіны кастрычніка зноў сталі сведкамі незвычайных з'яў. Масава назіралі іх жыхары мікраёна 6-й школы. Вось меркаванне дырэктара школы, выкладчыка фізікі і астраноміі Валянціны Міхайлаўны Шавырынай. На пытанне, што ж адбылося 15 верасня, яна адказала: «А трэцяй гадзіне дня на ясным небе з'явіліся белыя квадраты вялікіх размераў, у якія былі ўпісаны матэматычныя знакі ў выглядзе звыклых для нас паштовых індэксаў. Растлумачыць іх пры дапамозе зямных навуковых аспектаў, думаю, немагчыма...».

15 верасня. Пяцікласніца Марына Лямешкіна:

— На апошнім уроку прыродазнаўства нехта закрычаў: «Глядзіце! Глядзіце!» Усе павярнуліся да вокнаў. А там у небе рабілася нешта дзіўнае. Спачатку мы выразна ўбачылі два вялікія пытальнікі, быццам напісаныя густой шчыльнай парай. Потым знакі ператварыліся ў двойкі, паміж якімі стаяў мінус, за двойкамі пайшлі дзве сямёркі і — праз інтэрвал — яшчэ тры сямёркі.

Васьмікласніца Света Дземчанка:

— На гадзінніку было прыблізна 14.45. Мы ў кабінеце займаліся з піянерамі. Раптам забягае Наташа Краўчанка з 8-га «Г» і з парога заяўляе: «Хутчэй паглядзіце на неба!» Там мы ўбачылі згрупаваныя алгебраічныя знакі «больш». Іх было тры пары.

Выкладчыца Ніна Максімаўна Леўчанка:

— У той дзень мы са старшакласнікамі знаходзіліся ў саўгасе «Паўднёвы» на зборы памідораў. Першае, што я ўбачыла, гэта квадраты ў небе. Іх было шмат, яны размяшчаліся са строгім інтэрвалам. Віселі вельмі нізка.

В. В. Рабаў, дырэктар завода кавальска-прэсавага абсталявання:

— А трэцяй гадзіне дня я праходзіў па тэрыторыі завода і, зірнуўшы на неба, убачыў там квадраты, а ў іх лічбы — унікальная з'ява!

26 верасня В. П. Лямешкін, жыхар вуліцы Ходаса:

— Каля сямі гадзін вечара я сядзеў у сваім «Масквічы», чакаў сям'ю з гасцей. Раптам убачыў прама перад сабой на цёмным небе яркі зеленаватышызы шар, крыху большы за Месяц. Ён усё павялічваўся і павялічваўся. Тут падышлі мае дзеці і таксама пачалі назіраць незвычайную карціну. Неўзабаве шар пабляк і растварыўся.

8 кастрычніка. У 17 гадзін і глыбокай ноччу такі ж святлівы шар у небе бачылі жыхары рыбакалгаса «Берагавы» і цэнтральнай часткі горада».

Пасля гэтага газета неаднаразова інфармавала сваіх чытачоў аб назіраемых анамальных з'явах. Старажытныя летапісы сведчаць, што нешта падобнае людзі назіралі і раней, называючы гэта «знаменнем». Што ж за інфармацыю неслі «сальскія знакі»?

Разгадкай займаліся вучоныя, спецыялісты, проста дапытлівыя людзі. Паўтара года працаваў над гэтым Міхаіл Гапонаў, спецыяліст па радыёразведцы і радыёпроцідзеянню. «Вынікі расшыфроўкі ўзрушылі не толькі мяне, але і ўсіх маіх сяброў, знаёмых у розных гарадах краіны», — піша ён у часопісе «Молодая гвардия».

Што ж удалося яму прачытаць? Пры дапамозе элементарных матэматычных аперацый над ланцужком сімвалаў і лічбаў ён знаходзіць найперш дату: «Сёмы месяц, чысло 19, 1999 года...» Гэта ж дата ўпамінаецца і ў прароцтвах славутага Настрадамуса! «У сёмым месяцы 1999 года з неба прыйдзе Бог жаху... удачай будзе правіць Марс...» Акрамя таго, гэта дата вельмі блізкая да даты мяркуемай астрафізічнай падзеі, вылічанай балгарскім фізікам Арсёнавай-Балер, — 18.07.1999. На гэту падзею ўказвае і радок з Пскоўскага летапісу, датаванага 1300 годам. Сэнс радка трактаваўся як масавы мор (альбо патоп), у любым выпадку як нейкае выпрабаванне чалавецтву, прыблізна праз дзве тысячы гадоў пасля прышэсця Хрыста, г. зн. у 2000 годзе.

Пры перакладзе на кірыліцу сальскія лічбы далі вядомае ўсім на працягу дзвюх тысяч гадоў імя: Ісус Хрыстос і далей: «сапраўды Сын Божы, ён жа, Бог, выратуе вас». Калі паставіць пытанне: «Калі выратуе?», то тут варта, лічыць даследчык, звярнуцца да даты, згаданай у Пскоўскім летапісе і ўдакладненай у «сальскіх знаках», — 19 ліпеня 1999 года. Ашаламляльнае супадзенне! Прадказанае ў сівой старажытнасці напамінаецца чалавецтву яшчэ раз! Як пісаў астрафізік Ральф Эстлінг, мы нярэдка выяўляем, што космас у цэлым, наша Сонца ў прыватнасці, і асабліва Зямля настолькі дакладна падагнаны да нас, што непазбежна напрошваецца пытанне: «А ці не Бог альбо нехта з аналагічным імем стварыў усё гэта, маючы на ўвазе перш за ўсё нас?». Гэта занадта многа для супадзення, нават для цуда, каб назваць усё чыстай выпадковасцю.

Акрамя ўказання на дату будучага выпрабавання і на новае прышэсце Хрыста, які выратуе нас, даследчыку ўдалося пры дапамозе «сальскіх знакаў» параўнаўча лёгка атрымаць значэнні асноўных фізічных канстантаў (чысло «П», энергія масы спакою пратона, пастаянная гравітацыйнага ўздзеяння і г. д.), што апісваюць уласцівасці бліжняга і дальняга космасу. На іх вылічэнне чалавецтву спатрэбіліся цэлыя стагоддзі! Лічбы расказалі таксама аб датах былых лёсаносных і астрафізічных падзей («тунгускі феномен», зацьменні Сонца, хрышчэнне Русі, нараджэнне Ісуса Хрыста).

Выйшаўшы на такія ашаламляльныя высновы, аўтар задаецца пытаннямі:

— Ці не зашмат супадзенняў, каб лічыць іх выпадковымі?

— Хто аўтары, якія змаглі даць столькі інфармацыі ў адным радку з лічбаў і сімвалаў?

— Ці не з'яўляецца гэта пасланне папярэджаннем?

— Ці не будзе 1999 год годам страшных выпрабаванняў і годам наступнага пераходу да эры стабільнасці і ўстойлівасці?

— Чаму тэкставая інфармацыя з «сальскіх лічбаў» ідзе на старажытнаславянскай глаголіцы?

— Ці не да нашчадкаў старажытных славян, якія валодалі раней глаголіцай, накіравана нябеснае пасланне?

— Ці не з мэтай паўплываць на нашу духоўнасць і інтэлект накіравалі нам гэта загадкавае пасланне нашы нябесныя «старэйшыя браты па розуму?».

(Па матэрыялах друку).

ПЫТАЙ!ІНІК

Нашы тэлефоны: 32-60-13, 32-44-02.

Пачакаем да сакавіка

24 снежня ў газеце «Звязда» быў апублікаваны праект Закона Рэспублікі Беларусь аб ветэранах. Там жа друкавалася пастанова Вярхоўнага Савета аб парадку дня нечарговай 8-й сесіі беларускага парламента. Аднак на самой сесіі пытанне аб ветэранах не абмяркоўвалася зусім. Колькі ж часу спатрэбіцца дэпутатам на вывучэнне і прыняцце гэтага закона?

М. КАРАТКЕВІЧ, ветэран працы, г. Гомель

Адказаць на гэтае пытанне мы папрасілі сакратара Камісіі Вярхоўнага Савета РБ па справах ветэранаў П. ПАПОВА:

— Нечарговая сесія займалася вырашэннем нечарговых пытанняў, у першую чаргу эканамічных. Што датычыць «ветэранскага» закона, то праект яго ўжо прыняты ў першым чытанні. Далейшае яго абмеркаванне перанесена на чарговую, дзевятую, сесію Вярхоўнага Савета, якая павінна адкрыцца ў пачатку сакавіка. Калі разгляд пройдзе паспяхова, то ў другім чытанні закон будзе прыняты. Думаю, што гэта будзе адно з першачарговых пытанняў сесіі. Адразу ж пасля прыняцця закон уступіць у сілу.

Тры абароты— не мяжа

У тэлевізійных рэпартажах са спаборніцтваў па фігурнаму катанню на канках часта сустракаюцца не вельмі зразумелыя тэрміны, напрыклад, «аксель». Ці нельга растлумачыць хаця б некаторыя паняцці?

Я. ХМЫЛЬНІКАЎ.

Мінск.

«Аксель» — самы эфектыўны і працяглы па свайму пралёту скачок, які робіць фігурыст з апорнай нагі (з пярэдняга ходу на вонкавым рабры канька). Пры гэтым кручэнне робіцца ў бок апорнай нагі, а прызямленне — на другую нагу з ходам назад.

«Сальхаў»—скачок з апорнай нагі (з ходам назад на ўнутраным рабры канька). Пры гэтым кручэнне робіцца ў бок апорнай нагі, а прызямленне — на другую нагу з ходам назад на вонкавае рабро канька.

«Рытбергер» — скачок з апорнай нагі (з ходам назад на вонкавым рабры канька), кручэнне — у бок свабоднай нагі, а прызямленне — на апорную нагу з ходам назад.

«Тулуп»—асобы тып скачка, так званы зубцовы, дзе асноўны штуршок апорнай нагі суправаджаецца і адштурхоўваннем зубцамі другога канька. Выконваецца з ходам назад на вонкавым рабры канька, кручэнне робіцца ў бок свабоднай нагі, а прызямленне — на апорную нагу з ходам назад на вонкавае рабро канька.

«Лутц» — таксама зубцовы скачок, пры якім штуршок выконваецца з ходам назад на вонкавым рабры канька, кручэнне — у бок апорнай нагі, а прызямленне — на свабодную нагу з ходам назад на вонкавае рабро канька.

«Фліп» — зубцовы скачок, пры якім штуршок выконваецца з ходам назад на ўнутраным рабры канька, кручэнне — у бок апорнай нагі, а прызямленне — на свабодную нагу з ходам назад на вонкавае рабро канька.

Зараз мацнейшыя фігурысты выконваюць найбольш складаныя скачкі—«аксель» у тры з палавінай абароты, «тулуп» у чатыры абароты, «лутц» — у тры абароты, «фліп» і «рытбергер» у тры абароты, а таксама каскады, дзе спалучаюцца скачок у тры абароты і скачок у два абароты.

Многія скачкі атрымалі сваю назву па прозвішчу спартсменаў, якія ўпершыню выканалі гэтыя скачкі на спаборніцтвах,— гэта Сальхаў, Рытбергер, Аксель, Лутц і інш.

Гарыць агонь Алімпіяды!

ALBERTVILLE 92

Сёння ў Альбервілі ўспыхне алімпійскі агонь. Гульні XVI Белай Алімпіяды адкрые Прэзідэнт Францыі Франсуа Мітэран. Паводле неафіцыйных звестак, сярод ганаровых гасцей гэтай цырымоніі будзе і Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын.

Гэта — сапраўднае свята сусветнага спорту — вялікае, радаснае, непадробнае. Тысячы атлетаў з самых розных краін збіраюцца адзін раз у чатыры гады, каб вызначыць самага спрытнага, дужага, вынослівага... А яшчэ праз спорт і з дапамогай спорту моладзь планеты вельмі часта вырашае і іншыя праблемы, у тым ліку і такія, як барацьба за раўнапраўе, мір і ідэалы ў жыцці.

Адна з самых шматлікіх дэлегацый на Алімпіядзе ў Альбервілі — аб'яднаная алімпійская зборная Садружнасці Незалежных Дзяржаў. 141 спартсмен выйдзе на старты спаборніцтваў... Далей, па ранейшай традыцыі, трэба было пісаць: «...пад сцягам нашай краіны». На жаль, не: цяпер справа абстаіць некалькі па-іншаму. Вобразна кажучы, на XVI Гульнях упершыню ў сваёй гісторыі наша зборная вымушана ўзняць... белы сцяг. Гэта — белы алімпійскі сцяг з пяцю пераплеценымі кольцамі на ім. Менавіта пад ім пройдуць спартсмены Садружнасці Незалежных Дзяржаў на ўрачыстым адкрыцці Алімпіяды, менавіта ён будзе ўзнімацца і на флагштоку ў гонар іхніх перамог... Такое рашэнне прынялі спачатку кіраўнікі спорту былога Саюза ССР, а потым — і міжнароднага алімпійскага руху.

Але не ў гэтым галоўная справа. Галоўнае, несумненна, у тым, што наша каманда па-ранейшаму з'яўляецца асноўным прэтэндэнтам на ўзнагароды Алімпіяды ў многіх відах спорту.

Прагнозаў сёння выказваецца вельмі многа. Большасць спецыялістаў, ды і аматараў, схіляюцца да таго, што пасланцам Садружнасці Незалежных Дзяржаў па сілах заваяваць 10—12 вышэйшых узнагарод Альбервіля. У ліку верагодных саіскальнікаў «золата» — лыжнікі Алена Вяльбе, Любоў Ягорава і Уладзімір Смірноў, канькабежцы Ігар Жалязоўскі і Мікалай Гуляеў, біятланісты Алена Галавіна, Анфіса Разцова, Валерый Мядзведцаў, Аляксандр Папоў, фігурысты Марына Клімава і Сяргей Панамарэнка, Наталля Мішкуцёнак і Артур Дзмітрыеў... Шмат надзей звязваюцца і са зборнай хакеістаў, ды і некаторыя маладыя спартсмены могуць у любы момант паднесці сюрпрыз. Што ж, як кажуць, дай Бог!

Сярод нашых алімпійцаў—тры прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь. Акрамя прыгаданых вышэй Ігара Жалязоўскага і Аляксандра Папова, гэта яшчэ і біятланістка з Наваполацка, двухразовая чэмпіёнка свету майстар спорту міжнароднага класа Святлана Парамыгіна. Прадстаўніцтва хоць і не зусім вялікае, аднак жа — моцнае, саліднае! І мы, натуральна, верым, што ў далёкім і таямнічым Альбервілі шчасце ім абавязкова ўсміхнецца...

Акрамя 141 удзельніка спаборніцтваў разам з нашымі атлетамі ў Францыю накіравалася вялікая група трэнераў, спецыялістаў, абслуговага персаналу. Яшчэ колькі гадоў назад яе састаў заставаўся па-за ўвагай журналістаў і, тым больш, аматараў спорту. Цяпер жа, як вядома, сакрэтаў ні ў кога няма. Учора стала вядома: разам са спартсменамі ў Альбервіль выехалі 105 так званых функцыянераў спорту. Гэта — бюро дэлегацыі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, адміністрацыйная група, кіраўнікі каманд па відах спорту, а таксама трэнеры, урачы, масажысты, перакладчыкі, вадзіцелі, механікі... У складзе бюро дэлегацыі—старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па фізічнай культуры і спорту, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта РБ Уладзімір Рыжанкоў.

...Цяжкай, з сапраўднымі складанымі зігзагамі аказалася для ўсіх без выключэння нашых атлетаў дарога ў Альбервіль. Імі выйграны дзесяткі адборачных турніраў, чэмпіянатаў былога Саюза ССР і цяперашняй Садружнасці Незалежных Дзяржаў, сусветных першынстваў і Кубкаў. У Францыю паехалі сапраўды мацнейшыя з мацнейшых. Нагадаем, што на папярэдняй Алімпіядзе 1988 года ў Калгары савецкая каманда заваявала 29 алімпійскіх медалёў: 11 залатых, 9 сярэбраных і 9 бронзавых, і заняла першае агульнакаманднае месца. Думаем, ніхто не будзе супраць, калі ў Альбервілі іх будзе не менш, а больш.

Алімпіяда — на старце! Зборную Садружнасці Незалежных Дзяржаў пад белым алімпійскім сцягам сёння вечарам выведзе на парад адкрыцця наш славуты зямляк канькабежац Ігар Жалязоўскі.

Беларускі бізнес: 45 дзён і ўсё жыццё

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

каштарыс затрат на яе ажыццяўленне. Старшынёй праўлення фонду зацверджаны намеснік генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства «Бабруйскшына», кандыдат эканамічных навук М. Бабрыцкі.

Ёсць таксама дамоўленасць з Міністэрствам замежных спраў аб стварэнні своеасаблівай «зялёнай лініі» для паездак дзелавых людзей за мяжу — а гэта з'ява, калі значна спрашчаюцца цяперашнія правілы зносін з замежжам, для нас наогул нечуваная. З пазіцыі зусім ужо нетрадыцыйных для нашай савецкай псіхалогіі падыходаў я разглядаў бы і ідэю стварэння пад Мінскам «горада будучага» — зоны вакол аэрапорта «Мінск-2», своеасаблівага дзелавога цэнтра, пры развіцці якога будзе дадзена свабода для прыцягнення сюды замежных фінансавых інвестыцый.

На асамблеі кіраўнік урада, разважаючы аб шляхах выйсця з эканамічнага крызісу, прывёў прыклад Кітая. Сапраўды, прыватны бізнес зрабіў там вельмі многае. Чаму б нашым прадпрымальнікам не ўзброіцца карысным вопытам? Задумана — вырашана: у складзе ўрадавай дэлегацыі, якая праз паўтара тыдня вылятае ў гэтую краіну, ёсць два бізнесмены— генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Белатракцыён» А. Калінін і віцэ-прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў М. Шавельзон. Дарэчы, ён, аналізуючы перыпетыі прайшоўшай асамблеі, выявіў, апрача ўсяго іншага, і адмоўныя заканамернасці ў адносінах некаторых структур улады да прадпрымальніцтва:

— Я зрабіў два нечаканыя для сябе вывады: прыемным сюрпрызам для мяне была шчырая зацікаўленасць Старшыні Саўміна ў нашых справах, з другога ж боку ўразіла адсутнасць у яго дакладнай інфармацыі аб выніках вытворчай дзейнасці прадпрымальнікаў. Адкуль узялася, напрыклад, такая лічба: маўляў, бізнес дае толькі 2 працэнты ад усяго аб'ёму вытворчасці эканомікі рэспублікі? Гэта, бяру на сябе смеласць сцвярджаць, чарговы «жарт» дзяржаўных статыстычных органаў. Мэтанакіраванасць такіх падыходаў відавочная.

Сапраўды, жаданне прынізіць ролю і значэнне прадпрымальніцтва праяўляецца дзе-нідзе даволі яскрава. Лічбамі, зразумела, можна маніпуліраваць як хочаш, але прывядзём такі факт: летась толькі будаўнічыя кааператывы выканалі работ на суму больш як 700 мільёнаў рублёў. Аднак у справаздачах гэтыя здабыткі заносяцца ў графу дзяржаўных трэстаў і аб'яднанняў, а тыя прадпрымальнікі, якія здабывалі поспех, чамусьці застаюцца за кадрам.

...На памяць прыходзіць гістарычны прыклад, калі старажытнарымскі сенатар Катон Старэйшы ўсе свае прамовы ў сенаце заканчваў словамі: «Карфаген павінен быць разбураны». Аналогія, напэўна, не самая ўдалая, але, здаецца, існуе уладарнае патрабаванне часу: неабходна разбураць у свядомасці грамадства той бастыён, які называецца неўспрыманнем рынку. І адначасова — ствараць культуру рынкавых адносін, адпаведнага дзелавога клімату. Каб не здарылася так, як у адным са шматлікіх негатыўных прыкладаў дзейнасці нашага «перакошанага» рынку: польскія бізнесмены правялі ў нас паспяховыя перагаворы і, задаволеныя, паехалі дамоў. А на граніцы іх без дай прычыны два дні пратрымалі галодным і халоднымі. Пасля такога, прама скажам, пляўка ў душу хто ж захоча мець з намі справу? Гэтыя і многія іншыя праблемы даволі скрупулёзна дыскуціраваліся на прэс-канферэнцыі.

Так, за 45 дзён свет, як кажуць, не перакуліцца, а мы з вамі сваю псіхалогію і выхаванне поўнасцю не пераробім. Аднак добра ўжо тое, што ў выніку пад гэты працэс будзе падведзена трывалая база.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ, аглядальнік «Звязды».

Гараскоп на тыдзень

КАТМАНДУ, 7. (Кар. ІТАР—ТАСС Сяргей Буланцаў).

КАЗЯРОГ, вы памятаеце, што аўторак багаты для вас нечаканымі непрыемнасцямі? Бізнесмен пазбегне невялікіх страт, калі выйдзе з гульні і забярэ ўкладзеныя ў справу грошы. Вам патрэбны рэкамендацыі вопытнага эксперта.

ВАДАЛЕЮ астролаг прадказвае значныя страты пры заключэнні дагавораў. Хранічная няхватка часу. Лепшыя дні для вырашэння фінансавых пытанняў — 11 і 12 лютага. Моладзь зацягнута вірам кахання. Пра мужа і жонку сказана: мілыя сварацца — толькі цешацца.

РЫБЫ атрымаюць шмат заманлівых прапаноў: заключыць новы кантракт, заняць больш высокую пасаду, прыняць удзел ва ўрачыстасці, уступіць у шлюб. Планеты вам спрыяюць. 12 лютага голас інтуіцыі падкажа правільнае рашэнне.

На АВЕНА нібы з неба ўпадуць грошы, якія былі страчаны нядбайным партнёрам. Прабачце яго, але надалей спраў з ім не майце. Каханне авалодае ўсімі вашымі намерамі.

ЦЯЛЬЦУ шкодзіць уласцівая гэтаму знаку Задыяка ўладарнасць. Вы пазбаўлены дару дыпламатыі, і гэта псуе адносіны з калегамі па рабоце. Прадастаўце ім на наступным тыдні магчымасць прымаць рашэнні самастойна — не прагадаеце. Людзям ва ўзросце ад 38 да 50 гадоў, магчыма, спатрэбіцца добры ўрач.

БЛІЗНЯТАМ дараваны 12 і 13 лютага для здзяйснення рашучых учынкаў. У гэтыя дні вы можаце атрымаць паведамленне аб павышэнні. Прадстаўнікам цудоўнага полу, якія займаюць адказныя пасады, трэба баяцца падкопаў зайздроснікаў.

РАК, які заключыць выгадную здзелку, павінен шчодра аддзякаваць партнёру або пасрэдніку. Памятайце: скупасць караецца нябёсамі. Парада жанчынам: калі ў вас на рабоце нясцерпная абстаноўка, кіньце яе. Астролаг абяцае больш падыходзячую.

ЛЬВУ свяцілы спрыяюць у рэалізацыі новых планаў і ідэй. Не марудзьце, інакш удача адвернецца ад вас. На гарызонце нечаканае каханне.

Для ДЗЕВУ наступаюць цяжкія часы, хоць 14 лютага вы, верагодна, зноў выйграеце ў латарэю. У астатнім — суцэльныя няўдачы, усё не клеіцца і валіцца з рук. Перасільце сябе і працуйце, інакш вас апярэдзяць сапернікі.

ШАЛЯМ планеты рэкамендуюць адмовіцца ад рэалізацыі грандыёзных планаў: вельмі шмат падводных камянёў. Не звальняйцеся з работы, пакуль не атрымаеце новую сур'ёзную прапанову.

Калі СКАРПІЁН выкарыстае свае здольнасці празарліўца, то разгледзіць будучую ўдачу за частаколам мітусні і руціны. Мужа і жонку і закаханых чакае цяжкі перыяд.

СТРАЛЕЦ 11 і 12 лютага рызыкуе ўступіць са спадарожнікам жыцця ў сварку на словах, якія пяройдуць у сямейныя баталіі. Магчымы моцная стомленасць і недамаганне. Мужчыны, вазьміце на сябе частку дамашніх хлопатаў, ваша жонка літаральна валіцца з ног.

Праграма тэлеперадач

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Манеўры на пятым паверсе». Маст. фільм.
10.00. Паказвае Гродна. «Гарадніца».
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Меркурый. Праграма для дзелавых людзей.
12.15. «Мы такія розныя». Музычна-забаўляльная праграма.
13.25. Скарбы беларускай гісторыі.
13.55. «Квартэт «Ква-ква», «Залатыя словы». Мультфільмы.
14.15. Кінаэкран-92. Люты.
15.50. «Малады і...» Творчы партрэт артыста Г. Волчака.
16.40. «Я і мы». Мастацка-публіцыстычная праграма.
17.40. Сустрэча для вас. Наш госць — камандуючы войскамі БВА генерал-палкоўнік А. І. Кастэнка.
19.00. Панарама.
19.25. Дабрачынны канцэрт ансамбля «Харошкі». Частка 1-я.
20.25. Калыханка.
20.45. Экран беларускага кіно. «Вечны муж». 1-я і 2-я серыі. У перапынку (22.05) — Тэлебіржа.
22.40. НІКа.

Першая праграма

8.00. Хранікальна-дакументальны фільм «Абуджаная Афрыка»
9.00. Ранішняя музычная праграма.
10.10. А. Скрабін. Фартэпіянныя мініяцюры.
10.40. ЭХ. Экалагічная хроніка.
10.55. «Экалагічная хроніка.
11.10. Мультфільм «Пасля таго, як...».
11.30. «Прадпрымальнік».
12.30. Музычны кіёск.
13.00. Мастацкі фільм з серыі «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Ведзі. «Афіцэры».
14.50. «Пчала Мая».
15.15. Ян Сібеліус. «Сумны вальс».
15.20. Да Міжнароднага тэлемарафону «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
15.35. Каханне з першага погляду. Дзень 1-ы.
16.15. Фільмы рэжысёра Г. Данеліі. «Не сумуй!»
17.50. Адкрыццё Зімніх алімпійскіх гульняў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «...Гонар маю. А. Пушкін».
21.10. На Зімніх алімпійскіх гульнях. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.50. Баль алімпійцаў.
0.50. «Злачынца даслаў кветкі». Маст. фільм з серыі «Дэрык» (Германія).

Расійскі канал

12.00. Адкрыты свет.
13.00. Весткі.
13.20. «Я сюды больш не вярнуся». Маст. фільм.
14.50. Са сваёй званіцы.
15.10. Тэлецыкл «Нашчадкі». Фільм 6-ы «Свята».
15.35. М-трэст.
16.10. Парламенцкі веснік Расіі.
16.25. Познер і Донах'ю.
17.20. Шматсерыйны мультфільм «Прыгоды Боска».
17.50. Адкрыццё Зімніх алімпійскіх гульняў.
19.45. Весткі.
20.05. Свята кожны дзень.
20.15. «Санта-Барбара». 22-я серыя.
21.05. «Вясёлыя хлопцы» запрашаюць...
22.00. Весткі.
22.25. Праграма «А».
23.25. Рускі стыль.

9 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Безыменная зорка». Маст. фільм.
10.55. Асілак
11.45. НІКа.
12.30. «Мы такія розныя». Музычна-забаўляльная праграма.
13.20. Пра шахматы і шахматыстаў.
13.55. «У канцы тысячагоддзя». Спектакль.
16.10. Весьціца.
16.25. «Марынеска». Дак. фільм.
17.30. «Ад і да».
17.45. Творчы вечар паэта А. Лягчылава.
19.00. Панарама.
19.25. Дабрачынны канцэрт ансамбля «Харошкі». Частка 2-я.
20.25. Калыханка.
20.45. «Пратакол тайнай вячэры». Тэлеспектакль БТ.
22.00. «Каскад».
22.10. Дыялог. Сустрэча з прафсаюзным актывам у Вярхоўным Савеце РБ. Прымае ўдзел Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. Шушкевіч.
23.10. «Іван Васільевіч мяняе прафесію». Маст. фільм.

Першая праграма

7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «Спортлато».
7.45. Спорт для ўсіх.
8.15. Мультфільмы «Аліса ў Зазяркаллі». 1-я і 2-я серыі.
8.35. Раным-рана.
9.20. «Як адзін мужык спрабуе ўсіх нас накарміць».
10.00. Ранішняя зорка.
10.50. На Зімніх алімпійскіх гульнях. Лыжны спорт.
12.30. Сюіта з музыкі да балета «Раймонда».
12.45. «Форум». Прэм'ера музыкі.
14.00. Навіны.
14.20. «Вясёлка».
14.50. «Аліса ў Зазяркаллі». 3-я і 4-я серыі.
15.10. «Шмат галасоў — адзін свет».
15.15. «Клуб падарожнікаў».
16.15. «Каханне з першага погляду». Дзень 2-гі.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Тэлелоцыя.
18.10. Каляды ў Ялце.
18.40. На Зімніх алімпійскіх гульнях. Скачкі з трампліна.
19.25. Тэлеспектакль «Палата нумар шэсць».
21.00. Вынікі.
21.45. На Зімніх алімпійскіх гульнях. Канькабежны спорт. Санны спорт.
23.00. Навіны.
23.20. ІТВА «Астра» прадстаўляе: «Фенікс».
0.20. Прэзентацыя новай пласцінкі А. Сярова.

Расійскі канал

7.00. Весткі.
7.20. «Чорнае і белае Аляксандра Новікава».
8.00. «Хочаце, верце».
8.30. Дзелавая жанчына.
9.00. «Прызнанне ў каханні».
9.15. «Мяне выдалі на паверхню».
10.00. Аты-баты...
10.30. Зроблена ў «Фитиле».
11.30. Капітал.
11.45. Пецярбургскія магікане.
12.20. «Не хлебам адзіным».
12.50. Зігзаг удачы.
13.00. Весткі.
13.20. Паралелі.
13.50. Кабарэ «Вязгуздзіца».
15.00. У свеце жывёл.
16.00. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы.
16.45. Прашу слова.
17.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
18.00. «Шоў у рэжыме спыненага часу».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 23-я серыя.
20.30. Дзённік Алімпіяды.
21.00. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
22.00. Весткі.
22.20. Працяг Зімніх алімпійскіх гульняў.

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 лютага

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Музыка і спевы. 5 клас.
17.05. «Добры лес», «Калі ласкаі», «Малочны Нептун», «Панарошку», «Гарлачык». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы. «Мастацтва ўсіх часоў і народаў», «Доктар, зрабіце мяне прыгожай», «Маналог ля чырвонай мяжы».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Брэст).
19.35. Наш каментарый. «Вы нам пісалі...»
19.45. «Мілы гай». Фільм-канцэрт.
19.55. Фермер і калгаснік: пункты сутыкнення. Перадача з Гродна.
20.25. Калыханка.
20.45. Ліра. Частка 1-я.
21.45. Спартыўны тэлекур'ер.
22.05. НІКа.
22.20. Ліра. Частка 2-я.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы «Мумі-Троль і іншыя», «Мумі-Троль і камета».
8.10. «Пікавая дама». Мастацкі фільм.
9.40. Народныя казкі і прытчы розных краін. «Не выпрабоўвай лёс» (Інданезія).
9.50. Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Дагестана «Лезгінка».
10.35. «Лекі вакол нас».
10.55. Зімнія алімпійскія гульні. Лыжны спорт. 30 км. Мужчыны.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Гэта было, было...»
14.40. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная СНД — зборная Нарвегіі.
16.30. «Квака-задавака». Мультфільм.
16.40. Да Міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
16.55. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
18.00. Навіны.
18.20. «Пікавая дама». Мастацкі фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт.
21.05. «Новая студыя» прадстаўляе: «Мантаж», «Шлях да сябе», «Аднак». У перапынку (23.00)—Навіны.
23.40. На канцэрце А. Баянавай.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Італьянская мова.
8.50. «Дамашні клуб».
9.05. Дак. фільм.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. «Астравы разладу. Погляд з Японіі». Частка 1-я.
10.30. Адкрыты свет.
11.30. Дыялог з камп'ютэрам.
12.10. Рускія сезоны.
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
16.00. Школа менеджэраў.
16.30. Прашу слова.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Грані.
17.45. Тварам да Расіі.
18.00. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы.
18.40. Вольны час. «Калекцыянер».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Апошняя дарога Пушкіна». Дак. фільм.
20.30. Дзённік Алімпіяды.
21.00. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. Пятае кола. Працяг.

АЎТОРАК, 11 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Тандыр, арча, агонь...» Кінанарыс.
9.00. Музыка і спевы. 5-ы клас.
9.30. «Светлая асоба». Мастацкі фільм.
10.50. «Гаючая душа». Тэленарыс пра селяніна з Гродзеншчыны У. Купрыяновіча.
11.25. «Ад і да». Тэлетаргі.
11.40. «Каханнем за каханне». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
16.55. Выступленне Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам А. Лысенкі і выхаванцаў музычнага ліцэя пры Белдзяржкансерваторыі.
17.45. «Серабрысты званочак». Мультфільм.
18.00. Фільмы «Незнаёмы і дзівосны свет», «І расказала возера».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Як падзяліць непадзельнае?»
19.40. Сацыяльная абарона працоўных. У перапынку (20.25)—Калыханка.
21.20. Тэлебіржа.
21.35. «Кін-дза-дза!» Мастацкі фільм. У перапынку (22.40) — НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Лянота». Мультфільм.
7.50. Канцэрт Э. Вірсаладзе (фартэпіяна).
8.45. «Палата нумар шэсць». Тэлеспектакль.
10.15. Дак. фільм «Дальта».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Рытмічная гімнастыка.
11.50. Свята танцора ў г. Уладзіміры.
12.50. «Матч-рэванш». Мультфільм.
13.10. С. Франк. Харал № 3 для органа ля мінор.
13.25. Гандлёвы рад.
13.45. «Вам гэта трэба?»
14.00. Навіны.
14.20. Урокі Вольгі Іваноўай.
14.35. «Станцыйны наглядчык». Мастацкі фільм.
15.40. «Лясныя казкі». Мультфільм.
15.55. Выступае Рашыда Ідрысава.
16.10. Разам з чэмпіёнамі.
16.25. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт.
17.00. Навіны.
17.20. Неастралагічны прагноз.
17.40. Мультфільм.
17.55. «Справа».
18.15. Фільмы рэжысёра Г. Данеліі. «Афоня».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Тэлевізійнае знаёмства». Урмас От гутарыць з Прэзідэнтам Украіны Л. Краўчуком.
21.30. «Фермата». Музычна-інфармацыйная праграма.
22.00. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная ЗША—зборная Германіі. У перапынку (23.00)—Навіны.
0.20. «Ваш выхад, артыст». Я. Ласько.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Птушкі побач з намі».
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Прастора плюс.
9.05. Сялянскае пытанне.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
11.00. Пятае кола.
12.45. «Вязмежжа на «Барыкадным».
13.00. Весткі.
15.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
16.30. Т. Ін. Ка.
16.45. Зімнія алімпійскія гульні. Дваяборства. Слалам.
18.40. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Сам сабе рэжысёр». Перадача 2-я.
20.05. Дзённік Алімпіяды.
20.25. Грамадская думка.
20.40. Люстры.
21.10. Аўташоу.
21.40. Дзелавы кур'ер.
22.00. Весткі.
22.25. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.

СЕРАДА, 12 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вольны табун». Кінанарыс.
9.00. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
9.20. Ліра.
11.30. «Кін-дза-дза!». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. «Тое-сёе з паштовай сумкі».
17.15. Экран дзіцячага фільма. «Кукурыгу», «Дарога дамоў».
18.00. Дак. фільмы «Два словы ў пісьме», «Галасы».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Прадбачанне і рэальнасць».
19.40. Аб партыях—без дыпламатыі. Шматпартыйнасць: знаходкі і страты.
20.25. Калыханка.
21.05. «Забіць дракона». Мастацкі фільм.
23.05. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы «Скарб», «Крот і жавальная гумка», «Кот у ботах».
8.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная ЗША — зборная Германіі.
9.30. Разам з чэмпіёнамі.
9.45. Фільм—дзецям. «Як Хашым быў вялікім».
10.50. Народныя мелодыі.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Погляд з правінцыі». Зямля варонежская.
12.10. Паралельныя сусветы.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. Сёння і тады.
14.50. «У бары брусніцы». Мастацкі фільм. 1-я серыя «Незамужняя жонка».
16.10. «Гісторыя без слоў». Мультфільм.
16.15. Зімнія Алімпійскія гульні. Санны спорт.
17.00. Навіны.
17.20. Рэформа: тыдзень за тыднем.
18.00. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
18.55. Мастацкі фільм «Дайце мне спяваць».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
21.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная СНД — зборная Чэха-Славакіі. У перапынку — Навіны.
23.45. Музычны прагноз.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Увага, здымаюць».
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. «Карэту мне, карэту!». Творчы партрэт В. Саломіна.
9.35. Дзённік Алімпіяды.
10.15. Расійскі фермер: погляд у будучыню.
11.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
13.00. Весткі.
15.00. Восень жыцця.
15.20. Зімнія алімпійскія гульні. Дваяборства.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы.
18.00. Грані.
18.40. Азы кар'еры.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.00. Дзённік Алімпіяды.
20.30. Тварам да Расіі.
20.50. Мультфільм.
21.00. «Так, прэзідэнт. Не, прэзідэнт».
22.20. «Пецярбургскі міф». Перадача 1-я.
23.00. «Біг-бенд Джэфарда Холмса».

ЧАЦВЕР, 13 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дарахан». Кінанарыс.
9.00. «Забіць дракона». Мастацкі фільм.
11.00. «Душы маёй царыцы». Фільм-канцэрт.
16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 7-ы клас.
17.05. «На парог мой сёла казка», «Хітрыкі Рамзеса», «Няўлоўны Фунцік», «Нехачуха». Мультфільмы.
17.45. «Рамэо і Юлія». Фрагменты з балета на музыку Г. Берліёза». Фільм-канцэрт.
18.00. Дак. фільмы «Гарадзецкія майстры», «Каб горан не згас».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Факты і меркаванні. «Незалежнасць. Нейтралітэт. Армія».
20.25. Калыханка.
20.45. Тыдзень беларускага ўрада.
21.00. Крок. «Пасля афганскай вайны».
23.20. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Дзядуля Агу». Мультфільм.
7.55. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная СНД—зборная Чэха-Славакіі.
9.15. «Дайце мне спяваць». Мастацкі фільм.
10.05. Дзіцячы музычны клуб.
10.50. Зімнія алімпійскія гульні. Лыжны спорт. 10 км. Мужчыны.
12.30. Чалавек і закон.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. Спявае В. Варанец.
14.50. «У бары брусніцы». 2-я серыя «Ягоравы».
16.15. «Ну, пачакай!» Мультфільм.
16.20. ...Да 16 і старэйшым.
17.00. Навіны.
17.20. Да Міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
17.30. Зімнія алімпійскія гульні. Лыжны спорт.
18.25. Мастацкі фільм «Там, дзе неба ляжыць на зямлі».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
21.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Матч папярэдняга турніру. У перапынках — Навіны; «Крыміндфарм» паведамляе.
23.45—0.55. Сусветны музычны прыз Монта-Карла.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.05. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дымкаўская цацка.
9.00. Сялянскае падвор'е.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Фальклорны ансамбль «Чумакі» (Кіеў).
10.20. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
11.20. «Так, прэзідэнт. Не, прэзідэнт».
12.15. Адкрыты горад.
15.00. Пятае кола.
16.00. У імя сына.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Слалам. Жанчыны.
17.55. Парламенцкі веснік Расіі.
18.10. Зімнія алімпійскія гульні. Фрыстайл. Могул.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. Чытайце Шаламава.
20.00. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.30. Дзённік Алімпіяды.
21.00. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
22.00. Весткі.
22.25. Фігурнае катанне. Працяг.

ПЯТНІЦА, 14 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Роздум аб казцы». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 7-ы клас.
9.30. «Радасная душа». Фільм-канцэрт.
10.00. «Часовае знікненне лета». Інсцэніроўка паводле вершаў В. Куртаніч.
10.15. «Па следу ўладара». Мастацкі фільм.
15.25. Меркурый.
16.30. Навіны.
16.35. «Ромка, Фомка і Артос». «Верашок». Мультфільмы.
17.25. Сем колераў радасці.
18.00. Дак. фільмы «Флейта», «Ач гяла значыць нежанаты».
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. «Крок да згоды».
19.40. Якія мы гаспадары? Народнае прадпрыемства «Бабруйскдрэў».
20.35. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Экран беларускага кіно. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».
22.25. НІКа.
22.40. Фестываль беларускай песні ў Белавежскай пушчы. Частка 1-я.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Пеўнік Гок і хітрыя мышкі». Мультфільм.
7.45. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Матч папярэдняга турніру.
9.05. «Там, дзе неба ляжыць на зямлі». Мастацкі фільм.
10.20. ...Да 16 і старэйшым.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.20. Дак. фільм «У краі гаючых вод»; «Сібір на экране». Кіначасопіс.
13.00. Выступае ансамбль «Адыген».
13.30. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.20. Зімнія алімпійскія гульні. Санны спорт. Двойкі.
14.45. Хакей. Зборная СНД—зборная Францыі.
16.30. Чалавек і закон.
17.00. Навіны
17.20. Зімнія алімпійскія гульні. Скачкі з трампліна.
18.10. «Вампіры Геоны». Мультфільм.
18.20. «Мая сям'я і іншыя жывёлы». 6-я серыя.
18.50. «ВІД» прадстаўляе: «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Зімнія алімпійскія гульні. Канькабежны спорт.
21.10. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная Чэха-Славакіі — зборная Канады. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.45. «ВІД» прадстаўляе. «Эльдарада», «Шоу-біржа», «Хіт-канвеер».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Тэлеасамблея.
11.00. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
13.00. Весткі.
15.00. Прастора плюс.
15.30. Дыялогі дылетантаў.
16.00. Хто дапаможа расійскай культуры?
16.15. Дыялог з камп'ютэрам.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Прыватызацыя па-расійску.
17.15. «Мастак з Астожанкі». Валянцін Леановіч.
17.45. У пошуках згоды. 500 праз 500.
18.25. Версія.
18.40. Вольны час. «Увага: здымаю!»
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 24-я серыя.
20.20. Дзённік Алімпіяды.
20.50. «К-2» прадстаўляе: кінавіктарыну «Ведай нашых», праграму «Каронка»; Мастацкі фільм «На апошнім дыханні» (Францыя). У перапынках: Весткі; На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.

СУБОТА, 15 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Дзякуй за нялётнае надвор'е». Фільм-канцэрт.
9.35. Экран беларускага кіно. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Меркурый. Праграма для дзелавых людзей.
12.15. Праграма Гомельскай студыі тэлебачання.
13.15. 20 мінут рэдактара.
13.35. Спявае М. Мусабаеў (Казахстан).
14.05. Іншы экран. Пазнавальна-разважальная праграма.
14.35. «Эцюды на пяску». Кінанарыс.
14.50. Літаратурны тэатр. «І не толькі пра каханне...»
15.15. На шляхах адраджэння. Стварэнне Асацыяцыі фальклярыстаў Беларусі.
16.00. Танцуе ўзорны ансамбль танца «Равеснік» Палаца культуры прафсаюзаў Беларусі.
16.40. «Чарцяня» № 13», «Дзівосная бочка». Мультфільмы.
17.00. Паміж намі, жанчынамі... Не хачу быць хатняй гаспадыняй.
17.50. Аб рабоце міжнароднай гуманітарнай пазаўрадавай арганізацыі «Чарнобыль — дапамога».
18.40. Дак. фільм Беларускага тэлебачання «Жылі-былі людзі...».
19.00. Панарама.
19.25. Алё! Ёсць пытанне. Сустрэча са Старшынёй Вярхоўнага Савета Літвы В. Ландсбергісам.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. «Зімовы вечар у Гаграх». Мастацкі фільм.
22.25. НІКа.
22.40. Фестываль беларускай песні ў Белавежскай пушчы. Частка 2-я.

І канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. «Загадкавая планета». Мультфільм.
7.45. Відэаканал «Садружнасць».
9.00. Ранішняя музычная праграма.
9.30. «Цэнтр».
10.10. ЭХ.
10.25. «Вясёлка». «Каляда, калядкі...» (Беларусь).
10.55. Зімнія алімпійскія гульні. Лыжны спорт.
12.15. «ПАР. Развітанне з мінулым».
13.10. «Грамніцы».
13.30. Да Міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
13.50. Зімнія алімпійскія гульні. Лыжны спорт.
15.00. Навіны (з сурдаперакладам).
15.20. Мастацкі фільм «Варвара-краса, Доўгая Каса».
16.55. Хвіліны паэзіі.
17.00. «Пчала Мая».
17.25. Зімнія алімпійскія гульні. Хакей. Зборная Фінляндыі — зборная Швецыі. У перапынку — Канькабежны спорт.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. «Афіцэр з ружай». Мастацкі фільм (Югаславія).
22.20. Трэці фестываль КВЗ. У перапынку (23.00) — Навіны.
0.40. «Каханне з першага погляду». Дзень першы.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Наш сад.
7.50. Мультфільм.
8.00. Баскетбольны агляд НБА.
8.30. Шоу ў рэжыме спыненага часу.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. Як жыць будзем.
12.00. Педагогіка для ўсіх.
13.00. Весткі.
13.20. «Бурда модэн» прапануе...
13.50. Мастацкі фільм «Кар'ер».
15.40. «Нашчадкі». Фільм 7-ы «Беніта».
16.00. Са сваёй званіцы.
16.20. Мультфільм «Прыгоды Боска». 3-я серыя.
16.50. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы.
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. «Познер і Донах'ю».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Канцэртная праграма Пепсі-Вайрэд: Эрык Клэптан.
21.00. Дзённік Алімпіяды.
21.30. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
22.00. Весткі.
22.25. Фігурнае катанне. Працяг.

НЯДЗЕЛЯ, 16 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм.
10.10. Белыя і чорныя. Шашачны клуб.
10.40. Літарынка.
11.20. «Ну і ну, рыба размаўляе!», «Казка пра храбрага зайца», «Тры сінія, сінія азёры малінавага колеру». Мультфільмы.
11.45. НІКа.
12.30. «Будьце здаровыя!» Аб карысці загартоўкі прыродным фактарамі. Прамая лінія.
13.25. «Еднасць пачуццяў». Дабрачынны вечар у Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі.
14.25. «Гісторыя пра прынцэсу-пастушку і яе вернага каня Фаладу». Мастацкі фільм з субцітрамі.
15.45. Адраджэнне. Культурнаасветная праграма.
16.40. Весьціца.
16.55. Фантклуб.
17.40. «Ад і да». Тэлетаргі.
17.55. ПІК. Пазнавальна-інфармацыйны канал для падлеткаў.
19.00. Панарама.
19.25. Іграе Мірэй Маклахлен (Шатландыя).
20.05. «Нерасталы іней Волагды». Дак. фільм.
20.25. Калыханка.
20.45. «Гусарская балада». Мастацкі фільм.
22.15. «Каскад». Кантакт. Інфармацыя. Рэклама.
22.25. Фестываль беларускай песні ў Белавежскай пушчы. Частка 3-я.

І канал. Астанкіна

7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «Спортлато».
7.45. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне.
8.45. Раным-рана.
9.30. Пад знакам «пі».
10.00. Ранішняя зорка.
10.50. Навукова - папулярны фільм «Успамінаючы Барыса Пастарнака».
12.15. Марафон-15.
13.10. «Багатыя таксама плачуць» (Мексіка).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.15. Дыялог у прамым эфіры.
14.55. Зімнія алімпійскія гульні. Бабслей.
15.45. Клуб падарожнікаў.
16.45. Тэлелоцыя.
16.55. «Уолт Дысней прадстаўляе...»
17.45. Навіны.
18.00. Мастацкі фільм «Сон у летнюю ноч» (ЗША).
20.00. Вынікі.
20.45. Зімнія алімпійскія гульні. Канькі.
21.10. Хакей. Зборная СНД — зборная Канады. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.30. ІТВА «Астра» прадстаўляе: «Данской...».
0.25. «Каханне з першага погляду». Дзень другі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Мультфільм.
7.35. «Вясёлыя хлопцы» запрашаюць...
8.25. Хочаце, верце...
8.55. Праграма 03.
9.25. Дзённік Алімпіяды.
10.00. Аты-баты...
10.30. «Гасподняе лета мінула...»
10.50. Зімнія алімпійскія гульні. Біятлон.
13.00. Весткі.
13.20. Святое і вечнае.
13.40. Студыя «Нотабене».
14.25. Паралелі. «Балгарыя: вопыт і надзеі».
14.55. След «Піраньі».
15.25. «Гаварыце з радасцю — ён быў». (Да 120-годдзя з дня нараджэння А. М. Скрабіна).
16.00. Зімнія алімпійскія гульні. Горныя лыжы. Супергігант.
16.50. Чэмпіянат свету сярод прафесіяналаў НБА.
17.50. «Шчыра Ваш...». Монаспектакль Р. Карцава.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 25-я серыя.
20.30. Дзённік Алімпіяды.
21.00. Зімнія алімпійскія гульні. Фігурнае катанне. Спартыўныя танцы.
22.00. Весткі.
22.25. Фігурнае катанне. Працяг.

КААПЕРАТЫЎ «ПРЭСТЫЖ» ФІРМЫ «БАЛТАРУСІЯ»

◆ **ПРАДАЕ КУРТКІ з плашчовай тканіны** за наяўныя ці безнаяўны разлік, магчымы бартэр;

◆ **КУПІЦЬ ТКАНІНУ плашчовую, падкладачную, вацін, футра штучнае, ніткі, «маланкі», швейнае абсталяванне** айчыннай вытворчасці, якое было ў карыстанні, у арганізацый і насельніцтва за наяўны ці безнаяўны разлік;

◆ **ЗАПРАШАЕ НА РАБОТУ ШВЕІ** па пашыву верхняга адзення (магчыма работа на даму), **механіка па швейнаму абсталяванню;**

◆ **ВЫКОНВАЕ БРУСАВАННЕ**, зняцце скуры па таўшчыні, у выніку чаго яна робіцца больш тонкай і прыгоднай для пашыву адзення.

НАШ АДРАС:
Мінск, вул. К. Маркса, 20.
ТЭЛ. 27-23-85
з 9.00 да 18.00 (апрача выхадных).

ЗІМОВЫМ ДОЎГІМ ВЕЧАРАМ

ЧАЙКА БЯРЭ СТАРТ

Хто ўважліва назіраў за чайкамі, той заўважаў, што гэтая птушка звычайна ўзлятае насустрач ветру. Гэтак жа робяць многія птушкі, якім даводзіцца стартаваць з вады, асабліва ў ветранае надвор'е. Гэта адказ на пытанне, зададзенае «Вечарам...» 1 лютага.

ЦІ ЎСЕ РЫБКІ НА МЕСЦЫ?

Многія нашы чытачы правялі рэвізію рыбнага статку і выявілі, што адной з іх на другім малюнку няма. (гл. «Вечарам...» 1 лютага). Першым пісьмо з правільным адказам прыйшло ад магіляўчаніна В. Шостака.

ХОДАМ ШАХМАТНАГА КАНЯ

На малюнку пазначаны парадак хадоў шахматнага каня, якія складаюць з літар вядомую народную прыказку: «Умелыя рукі — памочнікі навукі». Гэтую задачу, змешчаную «Вечарам...» 1 лютага, нагадаем, даслаў мінчанін Рыгор Якуш.

У 1	А 12	У 23	К 18	Р 7
В 22	І 17	У 8	М 13	К 24
П 11	М 2	І 25	Я 6	І 19
Н 16	А 21	Л 4	К 9	О 14
Е 3	І 10	Ч 15	Н 20	Ы 5

СУРОВЫ ЗАКОН

Жыў калісьці жорсткі правіцель, які не жадаў нікога ўпускаць у свае ўладанні. Ля моста праз пагранічную раку быў пастаўлены вартавы. Яму было загадана дапытваць кожнага падарожнага.

— Чаго ідзеш?

Калі падарожны гаварыў няпраўду, вартавы абавязаны быў яго схапіць і павесіць.

Калі ж падарожны гаварыў праўду, яму і тады не было ратунку: вартавы павінен быў яго ўтапіць у рэчцы.

Такі быў суровы закон. І ніхто не рашаўся яго парушыць.

Але вось знайшоўся селянін, які, нягледзячы на суровы закон, спакойна падышоў да моста...

— Чаго ідзеш?—сурова спытаў у яго вартавы, рыхтуючыся пакараць смельчака, які ішоў на верную пагібель.

Але адказ быў такі, што азадачаны вартавы, строга выконваючы жорсткі закон, не мог нічога зрабіць з хітрым селянінам.

Што ж адказаў селянін вартавому?

Гэтую задачу даслаў мінчанін В. Рудакоўскі.

З ЛІТАРАЙ «Ш»

Перамалюйце гэтую фігуру на паперу і, разрэзаўшы яе на чатыры аднолькавыя часткі, складзіце з яе новую фігуру з цэнтральнай сіметрыяй. Знайдзіце месца і для літары «ш». Калі ўсё будзе зроблена правільна, вы прачытаеце па гарызантальных радках загадку. Разгадайце яе.

Гэтую задачу таксама даслаў мінчанін Рыгор Якуш.

І	Б	Е	Х	Т	О
У	К	?	Э	Б	Е
А	Р